Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 2 (458) | Чацвер, 11 студзеня 1940 года | Цана 20 кап.

## Выдатна падрыхтаваць паказ беларускага мастацтва ў Маскве

Работнікі мастацтваў Совецкай Беларусі падыходзяць да пачэснага экзамена. У маі гэтага года ў Маскве адбудзецца дэкада беларускага мастацтва. І ім — работнікам мастацтваў — належыць гонар паказаць перад усімі народамі Совецкага Саюза, перад вялікім Сталіным, якіх творчых вышынь дасягнула наша мастацтва, як квітнее ўся соцыялістычная культура нашай рэспублікі, які багаты талентамі наш народ.

Да дэкады засталося не шмат часу. І каб па-сапраўднаму паказаць багацце і ўзровень мастацтва беларускага народа, усяму калектыву работнікаў мастацтваў нашай рэспублікі патрэбна працаваць з вялікай страснасцю і энергіяй, усведамляючы сваю адказнасць перад народам.

Рыхтуючыся да дэкады — гэтага сур'ёзнага палітычнага і творчага экзамена, работнікі мастацтваў павінны вырашыць рад надзвычай важных задач, вызначаючых далейшы ідэйны і творчы рост нашага мастацтва.

Нашы тэатры вобразамі сваіх спектакляў павінны ярка і праўдзіва паказаць беларускі народ. Вобразы прадстаўнікоў народа ёсць у нашым мастацтве — гэта асноўныя вобразы п'ес і опер, пастаўленых тэатрамі рэспублікі. Аднак, трэба адзначыць, што гэтыя вобразы не з'яўляюцца сапраўды поўнацэннымі па сваіх ідэйных і мастацкіх якасцях, бо яны не выяўляюць з дастатковай паўнатой асноўныя рысы беларускага народа — мужнасць і непахіснасць, свабодалюбства і гераічны дух яго. Гэта сур'ёзная загана нашага мастацтва. Патрэбна дасканала прааналізіраваць мастацкую вартасць і праўдзівасць вобразаў народа, створаных у нашым мастацтве, і агульнымі сіламі работнікаў мастацтваў, пісьменнікаў, крытыкаў дапрацаваць іх, каб паказаць на дэкадзе свой народ жыццёва-праўдзіва, ва ўсёй яго велічы і магутнай сіле.

Калектывы нашых тэатраў, у першую чаргу Тэатра оперы і балета і Белдзяржтэатра, павінны па-сапраўднаму змагацца за мастацкую вартасць спектакляў. Кожная дэталь і сцэна спектакля, кожная роля — ад цэнтральнай да эпізадычнай — павінна быць аднолькава бездакорна распрацавана. Час навучыцца паважаць гледача і ліквідаваць недаацэнку маленькай ролі ці масавай сцэны.

Сур'ёзнай увагі патрабуе і праблема мастацкага афармлення. Колькі ў спектаклях нашых тэатраў неахайных дэкарацый і касцюмаў, зрэб'я і шэрасці! Гэта ідзе ад натуралістычнай бездапаможнасці, ад падмены творчасці рамесніцтвам і зноў-такі адмоўна адбіваецца на паказе нашага народа і выклікае справядлівае нездавальненне гледачоў. І мастакі, і рэжысёры павінны ўрэшце зразумець, што сапраўды мастацкі і праўдзівы паказ народа патрабуе не ўбогага зрэб'я, а яркіх фарбаў і зграбных касцюмаў, бо яны ўласцівы нашаму народу.

За кароткі час, які застаўся на падрыхтоўку да дэкады, работнікам мастацтваў прыдзецца зрабіць шмат чаго. Тэатру оперы і балета прыдзецца выпусціць оперы Е. Цікоцкага «Міхась Падгорны» са зробленымі папраўкамі і ў новай пастаноўцы, дапрацоўка оперы А. Багатырова «Дрыгва» і балета М. Крошнера «Салавей» і галоўнае — пастаноўка оперы А. Туранкова «Кветка шчасця».

Усе гэтыя работы тэатрам распачаты. Але няма патрэбнай накіраванасці сіл і энергіі на выкананне першачарговых задач, якімі з'яўляюцца хутчэйшы паказ гледачу оперы «Міхась Падгорны» і пастаноўка оперы «Кветка шчасця».

Філармонія, якая павінна падрыхтаваць заключны канцэрт, дагэтуль не мае цвёрдай праграмы канцэрта і ўсіх твораў, якія павінны быць падрыхтаваны. Дагэтуль абяцаннямі і пажаданнямі падмяняецца надзвычай важная работа па творчай узаемадапамозе Філармоніі, Кансерваторыі і Тэатра оперы і балета.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не забяспечылі разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва і патрэбнага ўмацавання соцыялістычнай дысцыпліны працы, творчага ўздыму ў калектывах работнікаў мастацтваў.

Падрыхтоўка да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве — справа ўсіх тэатраў, усіх калектываў работнікаў мастацтваў рэспублікі. Гэта падрыхтоўка — барацьба за новыя поспехі беларускага мастацтва, за далейшы росквіт яго.

Выступленнямі тэатраў — опернага і драматычнага, Філармоніі і Кансерваторыі, праслаўленых калектываў самадзейнасці Гомельскага клуба імені Леніна і Хойніцкага раёна не вычэрпваецца праграма беларускай дэкады ў Маскве.

Беларускі народ будзе рапартаваць Маскве, усяму Совецкаму Саюзу аб сваіх дасягненнях у будаўніцтве соцыялістычнай культуры і паказам тэатраў, і выкананнем твораў кампазітараў, і выступленнямі пісьменнікаў, і выстаўкай творчасці мастакоў, і паказам узораў народнай творчасці. Гэта ўскладае сур'ёзныя абавязкі па падрыхтоўцы шырокага паказу культуры беларускага народа на дэкадзе ў Маскве і на пісьменнікаў, і на мастакоў, і на ўсіх работнікаў культурнага фронта.

У радасныя дні дэкады беларускі народ хвалюючай мовай мастацтва раскажа аб гераічным шляху сваёй барацьбы за вызваленне, аб шчаслівым жыцці ў сям'і братніх совецкіх народаў, аб радасці з'еднання са сваімі кроўнымі братамі і выкажа сваю глыбокую ўдзячнасць і гарачую любоў да мудрай партыі большэвікоў, да правадыра народаў — таварыша Сталіна.

Вялікія клопаты праяўляе Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі і ўрад рэспублікі аб мастацтве. Дзякуючы гэтаму наша мастацтва мае ўсе неабходныя сродкі і ўмовы для паспяховага развіцця і там, дзе не так даўно панскі бот растаптваў усякія парасткі культуры — у нашых заходніх абласцях арганізавана шырокая сетка тэатраў, створана філармонія, адкрыты музычныя і мастацкія школы, дамы народнай творчасці.

Пачэсны абавязак работнікаў мастацтваў Совецкай Беларусі — з поспехам выпаўніць свой доўг перад народам, выдатна падрыхтаваць паказ квітнеючага соцыялістычнага мастацтва беларускага народа на дэкадзе ў Маскве.

ЭДЗІ АГНЯЦВЕТ

## КАЎКАЗ

*(Цыкл вершаў)*

***

Цябе я ў марах бачыла даўно,
Зялёны край,
разліва гор і мора.
Тваё святло ішло ў маё акно
І подых твой мне чуўся ў соснах бору

Цяпер глядзі,
табе прынесла я
Вітанне ніў,
прыгожы шум калоссяў.
Таму цяпер ... ...
Што мне ... ... давялося.

Калі стаю на кручы ветравой,
Ці п'ю з тваіх струменяў
серабрыстых, —
Кладзеш ты ўсе багацці прада мной,
Як гаспадар гасцінны,
сэрцам чысты.

Жаўцеюць мандарыны у садах
І з дрэў, здаецца, падаюць лімоны.
Пладоў тваіх мне любы спелы пах
І любы мне прыбоя спеў бяссонны.

Калі-ж ля гор я сустракаю тут
Сасонку,
ці палескія яліны, —
Яшчэ мацней мне родны кожны кут —
Твае, Каўказ, цясніны і даліны!

### НА ЧАЎНЕ

Зорка ўсходзіць над гарою
І мігціць на морскім дне.
Дрэмлюць хвалі.
Мы з табою
Праплываем на чаўне.

Паказаў дарогу месяц
Нам рукою залатой.
Ты пяеш.
Лясы Палесся,
Рэчак звон у песні той.

Я не знаю, што са мною, —
Мар маіх шуміць прыбой.
Можа, гэтаму віною
Мора,
зорка над гарой.

Пэўна, ветрык — птах крылаты —
Мне спакою не дае.
А, быць можа, вінаваты
Вочы сінія твае? —

Што вясною мімаволі
Сняцца мне ў дзявочым сне...
Дрэмлюць хвалі.
Мы паволі
Праплываем на чаўне.

### ПАЛЯЎНІЧЫ.

Я хадзіла над скалою,
Дзе ляжыць у неба пуць,
Дзе пад хмаркай залатою
Птушкі дзікія жывуць.

Там хадзіла, нібы дома.
І, пад гоман быстрых рэк,
Мне сустрэўся незнаёмы,
Вельмі дзіўны чалавек.

Бачу — ростам ён асілак,
Лёгка крочыць па траве.
Дрэмле ястраб шэракрылы
На ягонай галаве.

Свісне ён —
і перапёлкі
Адгукаюцца з лясоў,
І ўзлятае ястраб лоўкі,
Прадчуваючы улоў.

Я дзіўлюся:
— Што за звычай?
Кажа горда чалавек:
— Я мясцовы паляўнічы,
Па гарах хаджу я век.

Супіць ён сівыя бровы:
— Прыхадзі к нам на абед. —
Не, зусім ён не суровы —
Гэты просты, просты дзед!

— Наша хата ля даліны.
Бачыш?
Там прасторны сад.
Будзеш есці мёд пчаліны,
Самы спелы вінаград.

Кажа
й вухам паляўнічым
Чуе гоман птушак,
траў:
— Я пайду.
Мой ястраб кліча,
Перапёлак мне спаймаў.

Ён знікае — дужы, строгі,
З роднай сумкай за плячом.
Прада мной бягуць дарогі
У сад прасторны,
дзедаў дом.

### КАЎКАЗСКАЙ НОЧЧУ.

Прыходзіць ноч.
Яе жывыя вочы
Агнямі ззяюць дзіўнымі ў гарах.
Чытаю я сівую казку ночы.
Над возерам самотны кружыць птах.

Я тут адна.
Вятры з надхмарных высяў
Ка мне ў даліну мар не даляцяць.
І пальмы ля зялёных кіпарысаў,
Як моцна закаханыя, маўчаць.

Далёка ты.
Не прагнеш шумнай славы.
Твой карабель плыве між сініх льдоў
У краі тым, дзе не растуць і травы.
Дзе ты, мой друг, іх вырасціць гатоў.

Паўночны брыз імчыць праз акіяны,
Не помніць і шляхоў ягоны бег.
Ці чуеш ты скрозь буры і туманы,
Што часта я смуткую па табе?

Я пазнаю праз дальнія прасторы
Высокі лоб,
усмешку, друг, тваю.
Маёй журбе адна ёсць сведка — зоры:
Глядзяць,
як я ля возера стаю.

Я ведаю, —
прыедзеш неўзабаве,
Каб зноў паплыць у мора вечным ім.
Каўказа ноч
і вецер гор ласкавы,
Спявайце аб каханні аб маім.

Гагры, 1939 год.

15 студзеня спаўняецца 145 год з дня нараджэння славутага рускага драматурга і паэта А. С. Грыбаедава.

Аляксандр Сяргеевіч Грыбаедаў. Малюнак К. Тэдаровіча.

## ВЫДАТНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

У мінулым годзе Тэатрам оперы і балета БССР ажыццёўлены пастаноўкі шасці новых спектакляў: опер «Міхась Падгорны», «Русалка», «Царская нявеста», «Дрыгва» і балетаў «Бахчысарайскі фантан» і «Салавей». Да гэтага трэба яшчэ дадаць амаль гатовы спектакль таго-ж «Міхася Падгорнага» у значна зменёнай рэдакцыі, у новай рэжысёрскай трактоўцы запрошанага ў тэатр рэжысёра тэатра імені В. І. Неміровіча-Данчэнка — П. Златагорава і ў новым дэкарацыйным афармленні запрошанага ў тэатр маскоўскага мастака В. Волкава. Па сутнасці гэта сёмая пастаноўка тэатра за мінулы год.

Падрыхтоўка такой колькасці новых пастановак, пры дастаткова высокай іх якасці, за такі кароткі тэрмін, улічваючы велізарныя маштабы сцэны і вялікія цяжкасці тэхнічнай канструкцыі тэатра, гаворыць за вялікія патэнцыяльныя магчымасці, закладзеныя ў калектыве тэатра.

Падводзячы вынікі нашай работы, трэба адзначыць вялікі творчы рост усяго калектыва тэатра.

Колькасна і якасна выраслі асноўныя калектывы тэатра: — аркестр, хор, балет. Значна вырас і мастацка паспеў вядучы цэх салістаў.

У сучасны момант у тэатры працуе каля 800 чалавек. Гэта ў тэатры, які ўзнік усяго некалькі год назад з маленькай опернай студыі! Наш тэатр — малады арганізм, поўны творчых сіл і прагнучы вялікай работы.

Маладосць нашага тэатра, сілы, набапленыя ім, добрыя традыцыі, устанаўліваемыя тэатрам на глебе стварэння совецкай беларускай нацыянальнай музычнай культуры, — усё гэта дае нам радасць адчування вялікіх творчых перспектыў.

Адна з бліжэйшых радасных перспектыў тэатра — прадстаячая дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. Тэатр узмоцнена рыхтуецца да гэтай важнай падзеі.

Калектыўная мысль тэатра ўпарта і небеспаспяхова дабіваецца паляпшэння, шліфоўкі і больш дасканалай апрацоўкі наяўных пастановак.

Ёсць, нажаль, і мінусы ў жыцці нашага тэатра.

Першы мінус, і досыць адчувальны для работнікаў тэатра і для гледача, — гэта невялікі рэпертуар тэатра і адсутнасць у ім патрэбнай якасці твораў з багацейшай рускай і заходне-еўрапейскай опернай спадчыны. Другі мінус — гэта зусім непрыгоднае памяшканне для работы аркестра, так званая аркестровая п... ліна. Сапраўды, гэта — «шчыліна», ... якую дрэнна чуецца гучанне ар... які складаецца з 80 артыстаў і пры ... добрай кваліфікацыі. Ці трэба дока..., што мастацкія намеры дырыжо... многа знішчаюцца гэтай недасканалай «шчылінай», якую можна было ўжо ліквідаваць адпаведнай пераробкай.

Наш творчы план на 1940 год — гэта ажыццяўленне пастаноўкі опер «Кветка шчасця» А. Туранкова і «Чаравічкі» П. Чайкоўскага да юбілейнай даты геніяльнага кампазітара, оперы «Кацярына» Н. Шчаглова, развучванне якой пачата цяпер, балета «Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага, балета «Дон-Кіхот» Мінкуса.

Калектыў тэатра гарыць жаданнем даць новыя высокамастацкія пастаноўкі і дастойна паказаць мастацтва беларускага народа на дэкадзе ў Маскве.

**Н. ГРУБІН.**

**Галоўны дырыжор тэатра оперы і балета БССР.**

## ШЫРЭЙ РАЗГАРНУЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

Перад работнікамі мастацтваў БССР стаіць сур'ёзная задача паказаць дасягненні беларускага мастацтва на дэкадзе ў Маскве. Каб з гонарам выканаць гэту задачу, нам неабходна шырока разгарнуць сярод работнікаў мастацтваў соцыялістычнае спаборніцтва па падрыхтоўцы да дэкады.

Соцыялістычнае спаборніцтва забяспечвае творчыя поспехі работнікаў мастацтваў. Напрыклад, своечасоваму выпуску балета «Салавей» у Тэатры оперы і балета спрыяла соцыялістычнае спаборніцтва, разгорнутае ў балетным калектыве Старшыня мясцкома тав. Шчолкіна і дырэктар тэатра тав. Гантман сістэматычна правяралі ход выканання соцыялістычных абавязацельстваў, узятых творчымі работнікамі балетнага цэха. Гэта дало станоўчыя рэзультаты.

Асноўнай работай Беларускага саюза работнікаў мастацтваў з'яўляецца зараз арганізацыя соцыялістычнага спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да дэкады ўсіх прадпрыемстваў мастацтваў Беларусі.

Не мала работнікаў мастацтваў ужо ўключылася ў соцыялістычнае спаборніцтва. У Оперным тэатры паспяхова спаборнічаюць салісты. Галоўны балетмайстар тэатра тав. Мулер выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва галоўнага хормайстра тав. Бельскага. Соцыялістычнае спаборніцтва разгортваюць усе творчыя калектывы.

Калектыў Радыёкамітэта БССР заключыў соцыялістычны дагавор з Украінскім Радыёкамітэтам. Выкананне гэтага дагавора сістэматычна правяраецца.

Але трэба адзначыць і тое, што многія калектывы работнікаў мастацтваў да гэтага часу не ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва. Да іх адносіцца Белдзяржфілармонія, Беларускі дзяржаўны драмтэатр. Гэта сведчыць аб тым, што рад партыйных і прафсаюзных арганізацый не ўзначалілі творчага ўздыму работнікаў мастацтваў, не забяспечылі разгортвання патрэбнай масавай работы, мабілізуючай калектывы на ўзорную падрыхтоўку да дэкады.

**А. ЗІБІЦКЕР.**

**Старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза работнікаў мастацтваў.**

У Дзяржаўнай Трэцьякоўскай галерэі адкрыты мастацкія выстаўкі, прысвечаныя 60-годдзю І. В. Сталіна. **На здымках** (злева направа): Партрэт І. В. Сталіна работы мастака А. Герасімава (выстаўка «Сталін у выяўленчым мастацтве»); рэпрадукцыя з карціны мастака Бубнова «Сустрэча герояў» (выстаўка «Сталін і людзі сталінскай эпохі»); партрэт С. Орджанікідзе работы мастака В. Ефанава (выстаўка «Сталін у выяўленчым мастацтве»). Фота-кліша ТАСС.

## Сталін і людзі сталінскай эпохі

Совецкія мастакі адзначаюць 60-годдзе таварыша Сталіна мастацкай выстаўкай «Сталін і людзі сталінскай эпохі». Выстаўка гэта адкрыта ў Маскве ў Трэцьякоўскай галерэі.

Першы зал выстаўкі ахоплівае першыя годы рэволюцыйнай дзейнасці Іосіфа Вісарыёнавіча. Вялікі цыкл карцін выпаўнен мастаком А. К. Кутатэладзе. Сярод іх карціны «Дэманстрацыя ў Батумі ў 1902 годзе», «Сталін сярод сялян-горцаў», «Сталін у Баку».

У наступных залах размешчаны карціны, якія расказваюць аб вялікай дружбе Леніна і Сталіна, аб днях рэволюцыі і грамадзянскай вайны. Асабліва вылучаецца карціна В. С. Сварога «Штаб Кастрычніка». Сталін, як першы памочнік Леніна па кіраўніцтву ўзброеным паўстаннем, паказан у цэнтры карціны. Ён аддае загады камандзірам рэволюцыйных рабочых атрадаў. Побач, злева, стаяць Дзяржынскі, Свярдлоў і Урыцкі — яны дзейсныя ўдзельнікі тых бурных рэволюцыйных падзей, якія разгарнуліся ў Петраградзе.

Сярод карцін, прысвечаных Сталіну, як дзяржаўнаму дзеячу, творцу совецкай індустрыі і калгаснага ладу, адзначым добрае палатно Г. М. Шэгаля — «Сталін у прэзідыуме З'езда калгаснікаў» Мастаком пераканаўча перададна цеплыня сустрэчы таварыша Сталіна з калгаснікамі, любоў калгаснікаў да свайго правадыра.

Шырока прадстаўлены на выстаўцы партрэты лепшых людзей нашай краіны, якія справамі і подзвігамі сваімі сцвярджаюць вялікую праўду і таржаство ідэй Леніна — Сталіна. З жывапісных партрэтаў заслугоўваюць быць адзначанымі партрэт вялікага фізіёлага І. П. Паўлава, напісаны мастаком Н. В Несцеравым, партрэт народнага героя І. Д. Папаніна выпаўнены А. Герасімавым. Трэба адзначыць тут і карціну С. Герасімава — група, вы партрэт гераінь В. Грызадубавай, П. Осіпенка і М. Расковай. Шырока прадстаўлены скульптурныя партрэты.

З кампазіцыйных скульптурных работ хочацца перш за ўсё адзначыць скульптуру «Максім Горкі». Выдатны майстар Вера Мухіна здолела надаць вобразу вялікага пісьменніка, вернага друга правадыроў рэволюцыі Леніна і Сталіна, сілу горкаўскай мыслі і рэволюцыйнага пафаса.

Прадстаўлена на гэтай выстаўцы і беларуская скульптура. Асабліва радуюць новыя работы заслужанага дзеяча мастацтваў З. І. Азгура — партрэты слаўных саратнікаў вялікага Сталіна — Серго Орджанікідзе і Я. М. Свярдлова. Скульптару ў гэтых партрэтах у значнай меры ўдалося пазбегнуць той унутранай халоднасці, якія ўласцівы многім яго ранейшым работам. Вобраз Серго Орджанікідзе велічны і сардэчна просты. Скульптару ўдалося перадаць характэрныя рысы і ў партрэце Свярдлова.

Трэба асоба адзначыць надзвычай цікавую, хаця і не новую, работу А. М. Бразера — бюст народнага артыста Міхоэлса. Гэта выдатны партрэт, поўны ўнутранай асэнсаванай экспрэсіі, партрэт актора, пракладваючага новыя шляхі ў мастацтве.

Трэці беларускі скульптар А. П. Орлоў прадстаўлен эскізам «Сталін і Орджанікідзе». Мяркуючы па замыслу і кампазіцыі, можна сказаць, што гэта будзе цікавая работа аб вялікім Сталіне і яго саратніку Серго Орджанікідзе.

Выстаўка «Сталін і людзі сталінскай эпохі» — гэта творчы падарунак совецкіх мастакоў свайму любімаму правадыру таварышу Сталіну ў дзень яго слаўнага шасцідзесяцігоддзя

Масква. (Наш кар.).

## КАНЦЭРТ СІМФАНІЧНАГА АРКЕСТРА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ КАНСЕРВАТОРЫІ

Першы канцэрт аркестра студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі пад кіраўніцтвам прафесара І. А. Мусіна заслужана прайшоў з вялікім поспехам.

Усе цяжкасці пры выкананні сур'ёзнай, стыльнай праграмы канцэрта сі-бемоль мажорнай сімфоніі Шуберта, канцэрта Баха для двух скрыпак і ўверцюры Мендэльсона да музыкі к камедыі Шэкспіра «Сон у летнюю ноч» аркестр на чале з яго кіраўніком перамог бліскуча. Прыемна парадавала, нечакана ва ўмовах кансерваторскага аркестра, выключная дакладнасць, чоткасць нюансаў і штрыхоў, лёгкасць, чыстата інтанацый у выкананні сімфоніі Шуберта і ўверцюры Мендэльсона.

Камерная, філіграпная музыка сімфоніі Шуберта, напісаная ў венскіх традыцыях Моцарта, асабліва складаная і цяжкая для аркестра сваёй празрыстасцю. І трэба прама сказаць, што гэтым патрабаванні былі ў асноўным задаволены.

Салісты канцэрта — дацэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі лаўрэат усесаюзнага конкурса скрыпачоў А. Н. Амітон і дацэнт Белдзяржкансерваторыі засл. арт. рэспублікі А. Л. Бяссмертны выдатна выканалі канцэрт Баха для двух скрыпак. Да недахопаў выканання трэба аднесці адсутнасць адзінага выканаўчага плана. У інтэрпрэтацыі гэтага твора Амітон залішне захапіўся лірычнасцю, не данёсшы ўласцівую бахаўскай мове мужнасць, а Бяссмертны пры агульным правільным талкаванні твора дапусціў пагрэшнасці ў тэхналагічным плане.

Але асобныя выпадковыя недахопы, таксама як і асобныя недахопы ў выкананні аркестрам сімфоніі Шуберта і ўверцюры Мендэльсона (некаторая тарапкасць, сумятлівасць у фінале сімфоніі, недакладны строй у драўляных інструментах у уверцюры) не змаглі згладзіць добрага ўражання ад усяго канцэрта ў цэлым. Самае каштоўнае ў аркестры — любоўныя, дасканалыя, беражлівыя адносіны да матэрыялу праграмы. Падобнага роду пачынанні трэба ўсяляк падтрымліваць і вітаць.

**А. ДЭМБО.**

# Біяграфіі класікаў

Дзве кнігі У. Фінкеля — «Мендэле Мойхер-Сфорым» (ч. 1) і «Шолам-Алэйхем» уяўляюць сабою спробу поўмастацкай, поўпубліцыстычнай апрацоўкі біяграфій гэтых двух найвялікшых класікаў яўрэйскай літаратуры.

Задача вельмі нялёгкая, тым больш, што форма, абраная Фінкелем, з'яўляецца найбольш цяжкай для біёграфа. Побач з глыбокім, дасканалым веданнем эпохі ад яго патрабуюцца яшчэ і чыста пісьменніцкія здольнасці—мастацкі густ і ўменне расказваць.

Эпоха, закранутая ў гэтых двух кнігах, ахоплівае амаль цэлае стагоддзе. Маленства Мендэле Мойхер-Сфорым праходзіла ў годы жудаснага царствавання Мікалая І, а Шолам-Алэйхем памёр у 1916 годзе.

Але-ж як многа было падабенства ў дзіцячых гадах гэтых двух пісьменнікаў! Абодва яны нарадзіліся ў сем'ях местачковых багацеяў, у абодвух бацькі хутка разарыліся і яны яшчэ з маленства спазналі глыбокую галечу.

Абодвух, яшчэ зусім маленькіх, аддалі для «алукацыі» да «меламеда»—духоўнага настаўніка, і яны ад раніцы аж да самай ночы вывучалі схаластычную прамудрасць «талмуда» і «торы», абодва яны вельмі рана адчулі неабходнасць вызваліцца ад гэтага велізарнейшага цяжару сярэдневяковай заімшэлай «культуры» іх бацькоў і дзядоў, вызваліцца з-пад улады гэтых фантастычных светаў, напоўненых чарцямі, духамі, здзяннямі.

Жывое пачуццё, якое струменіла ў іх дзіцячых сэрцах, пагнула іх у поле, у лес, да жыцця—сапраўднага, яркага, шматкаляровага жыцця. Не гледзячы на забарону сваіх хатніх, яны заўсёды бегалі ў найбяднейшыя завулкі і там-жа, яшчэ змалку, прывучаліся ўпівацца мілагучнасцю сапраўднай народнай мовы, паэтычнасцю і хараством сапраўды народных казак і легенд.

Маладосць Мендэле Мойхер-Сфорым праходзіла ў невымоўна цяжкіх умовах. Ён многа вандраваў у пошуках заработку па дарогах Літвы, Беларусі і Украіны, дзе была найбольшая сканцэнтраванасць яўрэйскага насельніцтва. Ён назіраў узрушаючыя карціны глыбокіх і бясконцых пакут свайго народа, стагнаўшага пад трайным уціскам царызма, яго сатрапаў і чыноўнікаў, — народа, вечна ганімага, аблытанага павуціннем рэлігійных забабонаў, самага дзікага, сярэдневяковага фанатызма.

Карыстаючыся мноствам дакументаў з самых разнастайных крыніц, Фінкель намаляваў змястоўную карціну з жыцця яўрэйскага народа ў мінулым стагоддзі, з усімі бытавымі, эканамічнымі своеасаблівасцямі гэтага жыцця.

Першая частка кнігі «Мендэле Мойхер-[illegible]рым» абрываецца якраз на тым [illegible]ы, калі ў друку паяўляецца першы [illegible] Мендэле.

[illegible]л у першай частцы «Мендэле» [illegible]ейкая дыспраперцыя—многа рас[illegible] аб асяродзі, аб тым фоне, на [illegible]арыў пісьменнік, і мала ўвагі аддадзена самому Мендэле Мойхер-Сфорым, у партрэце якога нехапае многіх вельмі істотных рыс.

---

З імем Шолам-Алэйхема звязана цэлая эпоха ў развіцці яўрэйскай літаратуры. На працягу трох дзесяткаў год гэты геніяльны пісьменнік узначальваў яўрэйскую літаратуру.

У. Фінкель з любоўю разгортвае перад чытачом біяграфію Шолам-Алэйхема, поўную матэрыяльных нягод і маральных пакут за лёс свайго народа. У. Фінкель умее даваць трапны псіхалагічны рысунак, ён дэманструе бліскучае веданне паэтычных асаблівасцей і адценняў шолам-алэйхемаўскага стылю.

Прызнацца, мы адкрывалі кнігі Фінкеля з нейкай рэбкасцю. Было боязна сустрэцца з акадэмічнай сухасцю, як гэта часта бывае ў творах падобнага роду. Але-ж гэтага не здарылася. Многія раздзелы біяграфіі гучаць як зусім закончаныя і самастойныя навелы («На Грышку напалі разбойнікі», «Сон і ява» і інш.).

Хацелася-б у якасці прыкладу прывесці два невялічкіх урыўкі. Вось адзін з іх:

«Шолам марыць аб былой бесклапотнасці. Ён імкнецца перамагчы той пажар, які лёг на яго сям'ю. Ён сам пяпер адчуў яго. І ён бачыць гэты пажар на шмат кім з людзей у Варонцы. Яму хочацца вызваліць усіх ад турбот, ад нястачы, ад пакут і ад цяжкай працы.

Адзінаццацігадовага хлопчыка Шолама мучыць пытанне: як дамагчыся гэтага? А сродак ёсць: трэба знайсці скарб, які ляжыць у гары, па-за могілкамі, яшчэ з часоў Багдана Хмяльніцкага. Ён знойдзе гэты скарб і правядзе цэлую рэформу ў жыцці Варонкі.

Рудая Бася, што пячэ абаранкі, не будзе прапаваць так позна ўначы. Гергеле не будзе больш злодзеем, і ўсе беднякі ў мястэчку не будуць больш беднякамі. Яго тата зробіцца самым багатым у мястэчку. Бо хто самы лепшы і каму належаць больш, як не яго тату? Тады з высокага ілба таты знікнуць маршчыны, ён ужо не будзе выглядаць такім жоўтым. Зноў стане ён стройным і зграбным, як і раней.

Праўда, Шолам не ведае добра, што іменна знаходзіцца ў гары. Але-ж Шмулік яму пра гэта казаў. Ён нават памятае сон, які прысніўся яму пра скарб,—як яны з Шмулікам узняліся на гару і пралезлі ў пячору з крышталёвымі слупамі і ў палац з залатымі сценамі.

Надышоў вечар. Сонца ўжо села і неба на захадзе афарбавалася ў палымнеючы колер. У паветры адчуваецца сум па адыходзячаму дню, і гэты сум спіскае сэрца...

Здалёку бачыць ён дах свайёй хаты і яму хочацца дамоў».

А вось і другі ўрывак. У ім апісана сцэна выгнання маладога Шолам Рабіновіча (Шолам-Алэйхема) з дому кулака Лоева, куды ён паступіў хатнім настаўнікам і ў дачку якога ён закахаўся без ведама бацькі:

«На двары стаяла пара коней, запрэжаная ў сані... Гаспадар Лоеў выганяў яго з дому.

Залатое сонца асвятляла стэп. Коні шпарка ляцелі па бліскучых аснежаных прасторах, кавалкі снегу пырскалі з-пад капыт. У вачах мітусілася. Крыўда шчымела сэрца.

Коні ляцяць, звіняць бомы, свеціць сонца, а вецер плача нібы адзінокае дзіця, што блукае ў бездарожжы, сярод стэпавых прастораў. І ў вушах Шолама гучыць сумная песня геніяльнага ўкраінскага песняра Тараса Шаўчэнка:

Віюць вітры, віюць буйны,
Аж дерева гнуцца,
О, як болiць мае сэрца,
А слёзы не льюцца...»

У гэтых урыўках ёсць эмацыянальнасць, маляўнічасць, стрыманасць у тых дэталях, дзе лёгка ўпасці ў залішнюю сантыментальнасць: сум, які адчувае маленькі Шолам пры заходзе сонца, і раптоўны наплыў добрых пачуццяў у адносінах да таты, бабулі, маці і ўсіх навакольных так хораша і проста перадаюць настроі малога хлопчыка.

У. Фінкель прарабіў вялікую і ўдзячную работу. Вобраз вялікага пісьменніка, нястомнага змагара за рэалізм, за народнасць у літаратуры, супроць усякіх плыняў дробнабуржуазнай слёзна-сантыментальнай «літаратуры» У. Фінкелю ўдаўся.

Дзейнасць Шолам-Алэйхема, як пісьменніка, рэдактара і заснавальніка розных выданняў, У. Фінкель асвятліў падрабязна, усебакова. Фінкель паказвае, якой глыбокай любоўю і пашанай з боку народных мас быў абкружаны вялікі юмарыст. Яны наладжвалі яму бурныя авацыі, калі ён чытаў ім свае апавяданні, яны неслі яго на руках, калі ён прыязджаў у Амерыку, яны бясконцым натоўпам суправаджалі свайго пісьменніка ў апошні, сумны шлях. Шолам-Алэйхема ненавідзела буржуазія, якую ён высмейваў і бічаваў бязлітасна. Ён бачыў свайм мастацкім вокам, што буржуазны лад ніколі не вырашыць ні «адвечнага гора», ні адвечнага «яўрэйскага пытання». «Вы яшчэ ўбачыце—гаворыць Шолам-Алэйхем сваім дзецям—у Расіі будзе яшчэ вялікая рэвалюцыя... Але як дажыць да гэтага часу?» (раздзел «У вандраванні»). Толькі ў народзе Шолам-Алэйхем бачыў велізарнейшыя скарбніцы сапраўднейшага гуманізма, чалавечай чыстаты, чэснасці. Найвялікшы пясняр свайго народа, яго радасцей, гора і пакут,—такім ён назаўсёды застанецца ў памяці працоўных.

Такім ён быў у сапраўднасці, такім малюе Шолам-Алэйхема У. Фінкель. Яго кнігі з задавальненнем прачытаюць усе.

**Н. ЛІН.**



**Янка Купала.** Новая работа скульптара засл. дзеяча мастацтваў БССР З. Азгура.
Фота І. Каплінскага.

АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА

# СЯМ'Я

*Урывак з паэмы*

Асела ў хаце цішыня,
Цвыркун і той прыціх пад печчу.
Сягоння дождж пайшоў з паўдня
І, як з вядра, ліе ўвесь вечар.

Маланка паласуе шыр,
І глухавата гром грукоча.
Не спіць з-за лівня брыгадзір,
Нібы і спаць зусім не хоча.

І хоць не баяліў Ігнат, —
Няма чаго баяцца грому. —
Але калі ударыць град —
Лічы пшаніцу за салому.

Пшаніца-ж у Ігнатаў рост,
Густая ўся і ўся як воск.
Якое важкае калоссе!
Граніца поля не відна
У нядзелю жніва пачалося.
А тут табе і на!

А колькі ён не спаў начэй,
Па калійну расліну ласціў.
Цурон з-пад страх вада цячэ, —
Не дождж, а цэлае няшчасце.

Ударыў недзе блізка гром.
Ігнат пабег на двор з вядром.
Падскочыла з пасцелі маці —
Відно занадта стала ў хаце.

Яна ад страху тры разы
Украдкам лоб перахрысціла,
А тут, здаецца, аж пазы
Даждём у хаце ўзварушыла.

Сядзеў на ўслоне дзед Аўдзей
І ўсцягваў плятавыя боты:
— А навальніца ўсё ідзе
І не спыняюцца грымоты. —

Сказаў ён ціха сам сабе,
І ўстаў павольна з табурэта:
— І як не сорамна табе,
А шчэ' культурная кабета...

І вось на ўсходзе праяснела,
Крыху грымота пацішала,
І толькі ў далях гром глухі
Нібыта ў пень, ці корч струхнелы
Кідаў з нябеснае страхі
Бліскучыя, як сонца, стрэлы.

Тым часам і Ігнат з вядром
Павольна увайшоў у хату:
— А хай ён згіне з перуном,
Ледзь грамавік не ўвесь разлатаў:

Казаў-жа ўчора Васілю:
— Глядзі, быць можа небяспека,
На радыё ўключы зямлю,
Пастаў дзяжурыць чалавека...

**
*

— Пайшоў зусім дождж не ў пару.
Але заўсёды так бывае,
Калі крыху прабегла рунь —
То дождж палеткі абмінае.

Яно-то вільгаці было,
Здаецца, ў гэты год не мала,
Не дарам збажыны сцябло
Як мае быць павыганяла, —

Ні то сабе, ні то старой
Казаў дзядок Аўдзей памалу.
— Ды гэтаю-такі вясной
Брыгада добра працавала.

А сабяром усё-ж у час,
Дык на дажынкавым абедзе
Не будзе сорамна, калгас,
Пачаставаць сваіх суседзей.

— Прылёг-бы й ты крыху, стары,
Яшчэ-ж на золак ледзь бярэцца
І цемнавата на двары,
Ды йсці няма куды, здаецца.

— Адкуль, кажу, табе ўсё знаць,
А можа-ж у мяне спатканне? —
Любіў стары пажартаваць,
Што ён завёў сабе каханне.

Яна-ж крывілася тады
І ўслед яму рукой махала:
— Каб болей мне не мець бяды,
Каб качарга цябе кахала!

Тады Аўдзей спыняўся ў хаце:
— Пажартаваў з табою, маці.
Прайду на луг, у чараты,
Мае стаяць там нераты;

Вось лепш скажы:
У добры час
Мне нераты свае патрэсці,
Каб шчупакоў усіх за раз
Не мог дахаты я прынесці.

# Князь Маргоеў

## Апавяданне

Машына ішла на трэцяй хуткасці. Лейтэнант Лордкіпанідзе, седзячы побач з вадзіцелем, адчуваў вялікую нецярплівасць. Яшчэ да світання яго невялікі атрад павінен быць на ўскраіне лесу, што ў вёсцы Свігач. За вёскай неабходна выключыць святло, каб раней часу не ўстрывожыць паноў афіцэраў. Закрадалася трывога,—не збіцца-б з шляху—дарог тут шмат і ўсе прасёлачныя, карта з польскімі надпісамі неяк яшчэ не зусім асвоена. Але вось управа бліснулі скупыя і радкія агні. Напэўна, Свігач?

Па карце дарога праходзіць бокам ад вёскі, але як адшукаць гэты паварот у цемнаце? На ўскраіне забрахалі зліўста, са злом, сабакі.

— Стой!—скамандаваў лейтэнант шоферу. Выскачыўшы з кабіны вадзіцеля, Лордкіпанідзе накіраваў двух байцоў пад камандай малодшага камандзіра Акім'ева на пошукі павароту.

Цемрадзь ледзь прыкметна пачынала шарэць. Сабачы брэх сціхаў. У далечы цямнелі няясныя контуры вёскі, пачынаў падаць халодны, ліпкі, як скрозь сіта, дробны дождж.

Машына стаяла без святла. Прайшло мінут дзесяць. На дарозе пачуліся крокі. Звяртаўся баец ад Акім'ева.

— Таварыш лейтэнант, паварот управа зусім блізка. А тут і лес побач, рукой падаць!—скорагаворкай, бышцам захлёбваючыся ад нечаканага адкрыцця, дакладваў баец.

Па маўкліваму знаку лейтэнанта, людзі бясшумна, у адну секунду, злезлі з машыны.

Быстрым крокам дзесяць байцоў рушылі за сваім лейтэнантам. Машына, каб пазбегнуць шуму, засталася на дарозе.

Праз поўгадзіны невялікі атрад чырвонаармейцаў падыходзіў да лясной ускраіны. А яшчэ праз дзесяць мінут ён ціха, у расчлененым баявым парадку, уваходзіў у гушчар лесу.

У галаве лейтэнанта Лордкіпанідзе была толькі адна мысль. «Ці не знялося афіцар'ё ноччу, да прыходу яго атрада?»

Паглыбіўшыся ў лес, раскінуўшыся ланцугом на чвэрць кілометра, атрад залёг да першых праблескаў світання.

Лейтэнант Лордкіпанідзе тры гадзіны назад атрымаў непасрэдна ад штаба дывізіі заданне раззброіць размясціўшуюся ў лесе каля вёскі Свігач банду польскіх афіцэраў, колькасны склад якой высветлен не быў. У мэтах найбольш паспяховага правядзення аперацыі, улічваючы дэмаралізаванае становішча польскай арміі, на ліквідацыю банды да вёскі Свігач пад заслонай начной цемры быў пасланы невялікі атрад з адным станкавым кулямётам пад камандай лейтэнанта Лордкіпанідзе. Састаў банды, прыблізна, вызначаўся чалавек у пяцьдзесят.

Ледзь стала світаць—быстра рушылі, захоўваючы цішыню, імкнучыся пазбегнуць залішняга шуму.

Чым глыбей,—лес станавіўся гусцей. Вузкая, ледзь прыкметная дарога віхляючы ішла ў гушчар, месцамі яе след губляўся і яна знікала зусім.

Высунуўшыся наперад, адзін з дазорных свіснуў птушкай і яшчэ раз паўтарыў свіст. Гэта азначала: «Конны вораг».

Лейтэнант даў знак. Ланцуг ужо не ішоў, а бег.

Лордкіпанідзе ўбачыў з поўсотні коннікаў, яны рухаліся па лесе ў рассыпаным парадку. Густыя зараслі дробнага ельніку замаруджвалі палякам адыход. Асобныя коннікі часамі былі добра відны. Правы фланг атрада Лордкіпанідзе абыходзіў палякаў, загінаючы ўлева,—трэба было перасекчы напрамак адыходу ворага.

Лордкіпанідзе рэзкім голасам падаў некалькі каманд:

— Другая рота, у абход, бягом марш!

— Першая рота,—агонь!

Блізкія да лейтэнанта байцы падхапілі:

— Кулямёты, к бою!

— Прыгатаваць гранаты!

— Першы ўзвод, у атаку!

— Другая рота,—бягом!

Стварылася ўражанне разгортваючагася к бою батальёна. З гушчы лесу палякі адказалі кулямётным агнём. У гушчары разрываліся не далятаўшыя да чырвонаармейцаў гранаты. Перад Лордкіпанідзе з-пад куста вырас уланскі юнкер у канфедэратцы з малінавым казырком. Ён трымаў рукі ўгару. Па знаку лейтэнанта улан лёг на зямлю.

Наш кулямёт заліваўся доўгімі чэргамі. Вораг адказваў моцным, але беспарадным агнём.

**
*

Афіцэры былі замкнёны ў агнявым кальцы. Разгубіўшыся, падымаючы рукі ўгару, яны па аднаму здаваліся.

— Сабраць афіцэраў у адно месца!—скамандаваў лейтэнант.

Некалькі дзесяткаў паручыкаў, капітанаў, тры маёры ўчарашняй дзяржавы сталі перад лейтэнантам. Іх акружаў канвой у складзе шасці чырвонаармейцаў. У вачах разгубіўшыхся афіцэраў была ярка адлюстравана просьба аб захаванні жыцця.

Стрэлаў ужо не было. Бой скончыўся. Банда была ўзята ў палон. Але раптам адзін за другім раздаліся два гулкіх стрэлы, за імі яшчэ стрэл і яшчэ.

Крокаў у пятнаццаці ад палонных афіцэраў, акружаных канвоем, у баку ад паляны стралялі малодшы камандзір Акім'еў і чырвонаармеец Спепашкін. Лордкіпанідзе кінуўся да іх. На паляне спрытна беглі два афіцэры. Адзін ужо, перабегшы паляну, схаваўся ў лесе, другі схаваўся за адзінока стаячае пасярод паляны дрэва, адстрэльваючыся з пісталета.

Лордкіпанідзе быў снайпер. Прыцэліўшыся з вінтоўкі, ён лавіў моманты, калі афіцэр, страляючы, высоўваў корпус з-за дрэва направа.

Адзін стрэл, другі, трэці...—афіцэр за дрэвам усплеснуў рукамі. Было відаць, як ён упаў.

Перад Лордкіпанідзе, тварам угору, ляжаў пажылы афіцэр, паручык ва ўланскай форме. Шапка была скамкана пад патыліцу, з-за вышытага золатам каўняра мундзіра выбіваўся брудны каўнерык. Уся галава была афарбавана белым срэбрам сівізны, толькі бровы і нафабраныя вусы былі чорныя. Вочы поўзакрыты, з тонкіх вуснаў зрываўся бязгучны стогн; ноздры правільнага, арлінага носа сутаргава трапяталі ад цяжкога, перарывістага дыхання. Сівы паручык паміраў. Адчуўшы каля сябе старонняга чалавека, ён з сілай адкрыў навісшыя на вочы павекі і на твары яго паявілася нешта падобнае да ўсмешкі, якая быстра закацілася ў закрыўшыхся зноў вачах.

Але вочы раскрыліся зноў, прапаўшай усмешкі не было і следу. Толькі заставаўся ліхарадачны бляск зрэнкаў. Гарачым позіркам паручык упіўся ў твар лейтэнанта. Было відаць, што афіцэр хоча гаварыць. Адкінуўшы нагой маўзер, які ляжаў каля паручыка, Лордкіпанідзе злёгку нагнуўся над афіцэрам.

Паручык шаптаў:—Я бачу, вы каўказец... Я таксама з Каўказа... Я з Асеціі... князь Маргоеў... Маргоеў... паручык рускай службы. У дваццатым годзе я ўцёк з Савецкай Расіі з генералам Брэдавым... Я паміраю, мне ўсёроўна... Гэта атрад палкоўніка Дамброўскага... Праследуйце яго неадкладна, нагаміце... Галоўныя сілы атрада блізка, у дзесяці кілометрах... — сівы паручык змоўкнуў, вочы зрабіліся шклянымі, нос стаў яшчэ вайстрэйшым—твар прыняў драпежны выгляд. Левая рука ў дарагой замшы засталася на жываце.

Пасьлядосвіткавая яснасць раніцы змянілася асядаючай пахмурнасцю прадказваючага дождж дня. Чорныя вочы князя Маргоева станавіліся шэрымі. Лейтэнант Лордкіпанідзе агідна адвярнуўся.

Подышлі машыны з байцамі, лейтэнант Лордкіпанідзе ўліўся з сваім атрадам у надышоўшыя новыя сілы. Палонныя пад канвоем былі ўведзены ў вёску. Прыбыўшы атрад кінуўся праследваць банду Дамброўскага.

На паляне і ў лесе валяліся рэшткі польскага снаражэння і князь Маргоеў. Труп наёмнага ландскнехта польскай службы, паручыка Маргоева, які за дваццаць год сабачай адданасці Жэчы Пасполітай не дaслужыўся да наступнага афіцэрскага чына, доўга валяўся на паляне ў лесе, што ля вёскі Свігач, пакуль не быў закапаны сялянамі ў агульную яму.

**Ул. ГЛАЗЫРЫН.**

Г. КАНАВАЛАЎ

# ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ

Цэнтральны Камітэт нашай бальшавіцкай партыі і асабіста таварыш Сталін з велізарнай увагай сочаць за ростам савецкай дзіцячай літаратуры, за яе якасцю, імкнуцца зрабіць дзіцячую літаратуру ўсебаковай, глыбокай, праўдзівай. Яны з вялікай павагай адносяцца да выдання твораў класікаў рускай літаратуры і літаратуры братніх рэспублік, якая дапаможа растучаму пакаленню вывучаць цяжкае мінулае нашай радзімы, будзе вучыць яго яшчэ больш любіць наша цудоўнае сёння.

«Надаючы вялікае значэнне дзіцячай літаратуры ў пытаннях выхавання і ведаючы слабасць пастаноўкі яе выдання, таварыш Сталін паставіў пытанне аб перадачы гэтай справы комсамолу, які, несумненна, яе лепш арганізуе» (Андрэеў).

Не так даўно дзесяты пленум ЦК ВЛКСМ абмеркаваў пытанне аб росце дзіцячай літаратуры і, выходзячы з указанняў партыі, намеціў канкрэтныя шляхі да паляпшэння справы выдання літаратуры, неабходнай для выхавання нашых дзяцей у духу комунізма.

Дзіцячая літаратура Беларусі, як і ўся літаратура наогул, расла разам з усёй нашай краінай і мае, у параўнанні з мінулым, значныя поспехі. Сваім ростам яна абавязана, у першую чаргу, нашым народным паэтам Янку Купалу і Якубу Коласу, пісьменнікам-ордэнаносцам Змітраку Бядулю, Міхасю Лынькову і іншым.

Янка Купала і Якуб Колас больш, чым хто-небудзь іншы з беларускіх пісьменнікаў, напісалі для дзяцей і пра дзяцей. Амаль у кожным буйным творы Якуба Коласа мы знаходзім праўдзівыя, жывыя, тыпічныя вобразы дзяцей. Вазьміце для прыкладу яго паэму «Новая зямля». Большая палова раздзелаў гэтай паэмы прысвечана апісанню дзяцей, іх забаў, імкненняў зразумець прыроду, яе таямніцы. Хто з прачытаўшых паэму не будзе памятаць Кастуся і яго маленькіх братоў, іх «дарэктара» Яську з яго прыгодамі, цудоўных пейзажаў і г. д.?

Альбо вазьміце другую буйную паэму Коласа—«Сымон-музыка». І ў гэтай паэме цэнтральнымі героямі з'яўляюцца дзеці. Уведзен Коласам вобраз юнага героя і ў аповесць «Дрыгва», і ў п'есы. Акрамя гэтага, Коласам напісана рад цікавых апавяданняў для дзяцей, казак, аповесцей. Успомніце яго зборнік «Першыя крокі», каторы чытаўся і будзе чытацца дзецьмі з вялікай цікавасцю. Успомніце аповесць «На прасторах жыцця» і шматлікія вершы.

Пе сядзіцца ў хаце
Хлопчыку малому,
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому.
—Мамачка галубка,—
Просіць ён так міла,—
Можа-б ты на рэчку
Пагуляць пусціла?

Кожны радок коласаўскага верша для дзяцей адшліфаван, прадуман, ад яго вее незвычайнай цеплынёй, глыбокім веданнем дзіцячага жыцця. Пішучы аб дзецях, Колас вучыцца ў вялікіх рускіх пісьменнікаў—Пушкіна, Талстога, Горкага і інш.

Прадаўжае Колас пісаць для дзяцей і ў сучасны момант, пісаць сур'ёзна, цікава, бачачы ў дзецях суровых крытыкаў сваёй работы.

Нямала зрабіў для дзяцей і народны паэт рэспублікі Янка Купала. Ім напісаны дзесяткі дзіцячых вершаў, створаны выдатныя песні, адна з якіх—«Хлопчык і лётчык»— вядома ўсёй нашай краіне і заслужана адзначана прэміяй. Янка Купала паказвае ў ёй імкненні совецкіх дзяцей, іх мары:

На моры зірнуць хоць раз вокам,
Як ходзяць па іх караблі.
Ляцець далёка, высока,
Ды так пабываць і ў Крэмлі.
І там з-пад нябеснае далі
Грымнуць громка ўсімі грудзьмі:
—Дзень добры, таварыш наш
Сталін!
Паклон з самалёта прымі!

Вялікую работу, асабліва за апошнія годы, прарабілі ў галіне стварэння цікавай дзіцячай кнігі Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Макар Паслядовіч, Віт. Вольскі, А. Якімовіч і іншыя пісьменнікі.

Аднак, трэба прама сказаць, што патрабаванні шматлікай арміі малых чытачоў нашай рэспублікі далёка яшчэ не задаволены. Дзіцячая літаратура прадаўжае ганебна адставаць ад культурнага росту чытачоў, ад развіцця гістарычных падзей.

Да гэтага часу дзеці не атрымалі добрай кнігі аб тым, «што з сябе прадстаўляе наша вялікая радзіма ва ўсіх яе галінах, чым наша краіна распалагае, якія ў яе багацці, чым яна адрозніваецца ад іншых краін» (Андрэеў). Не атрымалі яны добрых кніг аб правадырах нашай бальшавіцкай партыі, аб героях соцыялістычнай працы, кніг аб тым, чым наша рэспубліка была раней і чым стала ў братняй сям'і вялікага Совецкага Саюза. Няма ў нас добрых кніг аб жыцці Чырвонай Арміі, аб развіцці навукі і тэхнікі, аб росце соцыялістычных гарадоў і калгасаў.

У стварэнні дзіцячай кнігі, па віне Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі, дзіцячай секцыі Саюза совецкіх пісьменнікаў і ЦК ЛКСМБ не прымаюць удзелу вучоныя, педагогі, значныя людзі рэспублікі. Прафесар Перцаў і акадэмік Нікольскі чытаюць цікавыя лекцыі па гісторыі, акадэмік Шкатэлаў доўгі час працуе над даследваннем лясной гаспадаркі. Чаму-б гэтых «бывалых» людзей не прыцягнуць да ўдзелу ў напісанні для дзяцей цікавых кніг пазнавальчага характару?

Тэму аб совецкай школе закранулі ў сваіх творах усяго два-тры пісьменнікі (Якімовіч, Маўр), а ўсе астатнія, у большасці моладзь, пішуць пра тое, што трапіць пад руку, пішуць не ведаючы жыцця, не імкнучыся яго па-сапраўднаму вывучыць. Яны не шукаюць новых, цікавых тэм, не працуюць, як Колас і Купала, над удасканаленнем формы дзіцячых твораў, над іх мовай, не звяртаюць належнай увагі на якасны бок твораў для малышоў. Яны ніяк не могуць зразумець, што «з дзецьмі можна гаварыць і аб гісторыі, і аб маральных навуках, і аб літаратуры» (Чарнышэўскі), і прадаўжаюць размаўляць з імі «аб такіх рэчах і такой мовай, што разумнае дзіця адразу-ж заўважыць... прытворнае дзяцінства і будзе пасмiхацца над гэтым няўдалым і сумным дзяцінствам» (Чарнышэўскі).

Ды і на самай справе. Вось перад намі дзіцячыя вершы Т. Алесіна. Друкаваліся яны ў газеце «Піонер Беларусі». Прачытайце яго невялічкую навагоднюю казку «Радасна і весела» і вы зразумееце, што ад яе не будзе дзецям ні радасна, ні весела. Паэт абмежаваўся агульнымі заўвагамі, крыклівымі фразамі, замест таго, што:

Няма нашай радасці краю,
Няма шчаслівейшых прыгод,
Як тое, што мы ўжо маем,
Прыбаўлены радасны год.

Аб якіх прыгодах ідзе гутарка, які мы маем радасны год і да чаго ён прыбаўлены? Атрымаўся проста непатрэбны набор слоў.

Сустракаюцца ў казцы надуманыя і проста недарэчныя месцы і параўнанні. Гэта бывае асабліва тады, калі аўтар устаўляе асобныя радкі альбо словы толькі для рыфмы.

Мы возьмем цябе, ёлачка,
Калючая іголачка,
Сагрэем цябе ватаю,
Вячэраю багатаю,
У нас ты будзеш, ёлачка,
Прыгожай перапёлачкай.

Цікава, як гэта ёлачка і чаму можа зрабіцца «прыгожай перапёлачкай»? Ці не таму толькі, што аўтару патрэбна была рыфма?

Як ні шкада, аднак такія нізкаякасныя, напісаныя за некалькі дзён, а то і гадзін творы (некаторыя вершы Эдзі Агняцвет і казкі Герасімовіча) прадаўжаюць трапляць на старонкі нашага друку. Рэдактары не лічацца з якасцю, а крытыкі ўпарта маўчаць, не прызнаючы, як відаць, таварышаў, ствараючых кнігі для дзяцей, за пісьменнікаў, а дзяцей — за сур'ёзных чытачоў.

Крытыка чамусьці не заўважае таго, што той-сёй з паэтаў над вершамі для дзяцей працуе значна менш, чым над вершамі для дарослых. Вядома, што паэты А. Жаўрук і А. Ушакоў — здольныя і растучыя, што яны сур'ёзна падыходзяць да работы над вершам. Але-ж назвы большасці іх дзіцячых вершаў пачынаюцца з прыназоўніка «пра»: «Пра майго таварыша», «Пра муху-бурмуху», «Пра блазнівага катка» і г. д. Пішуць гэтыя паэты для дзяцей і аб тым, што высокая ўзнагарода, напрыклад, можа быць салодкай, як мёд, што вагоны бегаюць бягом і, вядома, ходзяць шагам і г. д.

Шкоднаму разважанню пра тое, што для дзяцей можна пісаць абы-як і не аб сур'ёзных рэчах, трэба даць рашучы адпор. Няправільна, памылкова думаць, што дзіцячы розум не праніклівы. «О, не, наадварот, ён толькі не вопытны, але, паверце, вельмі дасціпны і пранікліва. Навучаецца-ж дванаццацігадовы хлопчык разумець алгебраічныя формулы абстрактнасці, якія і даросламу не кожнаму растлумачыш» (Чарнышэўскі).

Няправільна падыходзяць да афармлення дзіцячай кнігі і асобныя мастакі. Мастак, па сутнасці, павінен дапаўняць пісьменніка, развіваць, паглыбляць выбраныя ім тэмы. Атрымоўваецца-ж часта наадварот: той-сёй з мастакоў пачынае працаваць над творам, дэтальна не вывучыўшы яго, і такім чынам псуе кнігу.

Над афармленнем кнігі апавяданняў Змітрака Бядулі прапаваў мастак Сварні. Да аднаго з апавяданняў ён намаляваў пажарышча. Усё згарала да шчэнту. Засталася адна толькі печ... на дзеравяным падмурку.

З халтурай, з адносінамі да дзіцячай кнігі, як да нечага другараднага, трэба павесці гарачую, бязлітасную барацьбу. Для нашых совецкіх рабят неабходна стварыць ідэйна насычаныя, высокаякасныя апавяданні, аповесці, раманы, вершы і паэмы.

«Трэба вывесці некаторых дзіцячых пісьменнікаў і мастакоў са становішча саматужнікаў-адзіночак, дзесяці і нешта пішучых, але адарваных ад нашай гераічнай сучаснасці. Трэба сабраць усё, што ёсць лепшага ў нашай краіне, і скарыстаць для дзіцячай літаратуры... Трэба зняць тыя ўмовы і межы, якія, несумненна, перашкаджаюць цэламу разу нашых відных пісьменнікаў пісаць на дзіцячыя тэмы ў літаратуры... Трэба прыцягнуць усяляк да стварэння дзіцячай кнігі ўсіх нашых лепшых пісьменнікаў, паэтаў і драматургаў» (Андрэеў).



У Мінскай карціннай галерэі адкрыта выстаўка работ мастакоў-графікаў заходніх абласцей БССР.

«Беспрытульныя», літаграфія. Работа мастака І. М. Маляравіча.

Фота І. Каплінскага.

# ПЯСНЯР РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Малады совецкі пісьменнік М. Дзехцяр пакінуў нам невялікую, але значную па сваіх мастацкіх вартасцях літаратурную спадчыну.

Амаль усе апавяданні Дзехцяра прасякнуты глыбокім лірызмам, глыбокай любоўю да нашай соцыялістычнай радзімы. Яго апавяданне «Помнік» — гэта лірычная паэма аб дзесяці маладых хлопцах, працуючых на будоўлі пад кіраўніцтвам старога інструктара Хемы Маляўскага, наіўна закаханых у неіснуючую дзяўчыну Асю, дачку Хемы Маляўскага; паэма аб той глыбокай любві да нашага соцыялістычнага будаўніцтва, якая аб'ядноўвае і старога інструктара і дзесяць маладых каменшчыкаў; паэма аб невычарпальнай веры ў наша юнацтва. «Новая пачалася гісторыя і новае юнацтва, яно ў нашых руках, гэта новае юнацтва». І апавяданне канчаецца апафеозам маладосці: «Вось мы, вось наша юнацтва. Вось наша будучыня».

Такім-жа лірызмам прасякнута і другое з ранніх апавяданняў Дзехцяра — «Пад дубам». На дубе былі павешаны белапольскімі акупантамі сем маладых партызанаў і «штогод, у такі летні дзень, дзень вызвалення, збіраюцца каля дуба навакольныя мястэчкі і калгасы. Увечары вакол дуба загараюцца вялікія кастры, кружацца парачкі, іграюць флейты і цымбалы. Да позняй ночы гараць кастры вакол дуба, і сем старых з запаленымі факеламі ў руках танцуюць пасярод харавода і здаюцца яны святочна-узвышанымі, як быццам легендарнымі».

У гэтых двух апавяданнях адна і тая-ж асноўная мысль. Гэта — глыбокая павага, глыбокая памяць аб тых, якія сваёй крывёю, сваёй адданасцю справе вызвалення народа стварылі цудоўнае, радаснае жыццё: і «светлы, заліты агнямі горад, і квітнеючыя сяленні і калгасы».

У кнізе «Наша зямля» найбольш удалым трэба лічыць бытавое апавяданне «Уласны ўрач».

Яўрэйскае мястэчка, якое пры царызме задыхалася ў беднасці і невуцтве і было асуджана на выміранне, — гэта мястэчка расквітнела пры совецкай уладзе, расце і развіваецца, як і ўся наша вялікая краіна. Адно з такіх мястэчак рысуе Дзехцяр. Яно ўжо мае сваю інтэлігенцыю, сваіх інжынераў, сваіх лётчыкаў і трактарыстаў. Не было толькі ў мястэчку свайго ўрача. І ўрач з'явіўся. Гэта дачка таго грузчыка Берл-Іцкі, якога ніхто не ведаў па імені, а звалі якога «чалавек, які ніколі не хварэў». З лёгкім юмарам рысуе аўтар прыезд урача.

З такім-жа неперадаваемым юмарам рысуе Дзехцяр сцэну наведвання амбулаторыі «чалавекам, які ніколі не хварэў», радасць бацькі, калі ён з'явіўся ў амбулаторыі першым, але здаровым пацыентам. Новая працоўная совецкая інтэлігенцыя вяртаецца на работу ў свае родныя вёскі і калгасы. Гэта праблема звароту інтэлігенцыі да сябе на радзіму амаль не закранута ў яўрэйскай літаратуры, і заслуга Дзехцяра, што ён першы закрануў гэту тэму, хаця недастаткова яе развіў.

Героі Дзехцяра любяць сваю краіну, свае гарады і вёскі. «Пейша наском бота чыркнуў па пяску і ўпарта сказаў: «тут я нарадзіўся і тут я загіну».

Дзехцяр удзяляў у сваіх апавяданнях шмат увагі тэме братэрства і садружнасці народаў Беларусі. З польскімі акупантамі змагаліся і беларускія і яўрэйскія працоўныя. І яны разам святкуюць дзень вызвалення і разам будуюць новае жыццё. «Як родны сярод родных сядзіць, абапёршыся аб дуб, кароткі і шырокі вясковы каваль... Сына ён не мае, вось гэты вясковы каваль, гэты Янкель. Ён прыходзіць сюды ўспамінаць чужога сына, бацька і маці якога плачуць бясконца і спадзяюцца, што калі-небудзь яшчэ вернецца ён, іх любімы сын. Якогасьці Арцёмку ён успамінае, гэты Янкель» («Пад дубам»).

У сваіх апавяданнях Дзехцяр рысуе перасяленне працоўных яўрэяў у Яўрэйскую аўтаномную вобласць, у Бірабіджан.

Такая тэма апавядання «Плотнік Генох». Стары сямідзесяцігадовы плотнік Генох едзе да сыноў у Бірабіджан. І радасцю і смуткам прасякнута яго апошняе развітанне з мястэчкам. «У летні дзень, калі цвет з дрэў стаў асыпацца і сталі ствараца першыя завязі, убачылі плотніка Геноха крочачым за мястэчкам, у напрамку да лесу. Там, за мястэчкам, на старым могільніку валяюцца два чорныя помнікі на старых магілах бацькі і маці. Бязмоўныя помнікі доўга глядзелі на яго, і ён паступова прайшоў міма. Ён адламаў толькі сухое вецце і пайшоў сваёй дарогай.

Яму яшчэ доўга суджана жыць. Ён зараз едзе дапамагаць будаваць новае жыццё і яму не да надмагільных помнікаў...»

Неабходна адзначыць уменне маладога празаіка пластычна абрысоўваць сваіх герояў. Дзехцяр умеў падкрэсліць характэрныя рысы сваіх герояў.

У сваёй другой кнізе апавяданняў «Наша зямля» Дзехцяр знайшоў свой творчы шлях, свой арыгінальны падыход да з'яў нашага жыцця, стаў ужо спелым мастаком слова. Гэта кніга апавяданняў паказвае, якія шырокія магчымасці адкрываліся перад пісьменнікам. Бязжаласна смерць спыніла гэта маладое жыццё, поўнае творчых сіл. Памёр шматабяцаючы пісьменнік, ад якога совецкая літаратура чакала многа.

**Г. ЯБРАЎ.**

# „ПА СОНЕЧНЫХ УЗГОРКАХ“

Зборнік вершаў Рыгора Нехая «Па сонечных узгорках», які нядаўна выйшаў з друку, звяртае на сябе асаблівую ўвагу.

У ім, як у люстры, адбіты ўсе самыя значныя недахопы нашай маладой паэзіі. Іменна гэта прычына прымушае пагаварыць аб зборніку больш сур'ёзна.

Перагортваючы старонкі кніжкі, мы сустракаем вершы на самыя разнастайныя тэмы. Нельга сказаць, што тэматыка Нехая абмежаваная. Тэма адданасці радзіме, вершы пра Чырвоную Армію, пра комсамол, вершы, прысвечаныя падзеям у Іспаніі, шматлікія лірычныя вершы, часам цікава задуманыя,—усё гэта багаты матэрыял для паэта.

Але з першых-жа старонак чытач расчароўваецца.

Вершы раздзел зборніка—«Слаўнае пакаленне»— не змяшчае ніводнага добрага верша. Схематызм і прымітыўнасць тэхнікі проста-такі здзіўляюць чытача.

Вось прыклад з верша «Слаўнае пакаленне».

Вось пілот комсамолка Раіса
Так нядаўна студэнткай была,
А цяпер у паветранай высі,
Як арліца, да хмар паплыла.

Гэта страфа не мае нічога агульнага з паэзіяй. Такі-ж празаічны пераказ падзей ёсць і ў вершы «Каб сады зацвілі...» Часамі не вытрымана кампазіцыя вершаў. Так, напрыклад, верш «Прабуджуся я рана» нагадвае два нецікавыя вершы, скленыя ў адзін. У вершы «Сыну» перапяваецца даўно перапетае: маці пералічвае сыну прафесіі, якімі ён можа аўладаць у будучым. Як гэта ўсё надакучыла!

Нават у лепшых вершах сустракаюцца шаблонныя выразы, імі перасыпан увесь зборнік. Што, напрыклад, могуць сказаць чытачу такія радкі: «калгасы прапаю кіпяць», «гімны-песні гарачай крыві», альбо «над стэпамі **буйнай трэллю адшумеў кавыль**»?

Такі радок, як «патрыёты радзімы сваёй, мы, як маці, яе палюбілі», нічым не адрозніваецца ад звычайнага радка з газетнага артыкула. А такіх выразаў у вершах Нехая многа.

У шмат якіх месцах зусім няма рыфмаў. Паэт рыфмуе такія словы як: зямлі—сіл, сваймў—пяю, ветры—пыл, размер. на—піонеры, запяе—лягець, баёў—жыццё і інш. Якія-ж гэта рыфмы?

А гэты-ж спіс можна было-б прадоўжыць. Што ўжо гаварыць аб шматлікіх дзеяслоўных рыфмах!

У пагоні за рытмам ці рыфмай аўтар часта дапускае няправільныя націскі ў словах (руплівa, прамнямі і інш.).

На старонках кніжкі ў вялікай колькасці трапляюцца стандартныя эпітэты. Калі дзяўчына—дык яна абавязкова стройная і маладая, калі луг—дык ён прывольны, калі вада—дык ключавая.

Усё гэта паказвае на беднасць паэтычнага слоўніка аўтара і на тое, што малады паэт безадказна аднёсся да выпуску свайго першага зборніка, уключыўшы ў яго слабыя вершы побач з добрымі.

А добрыя вершы ў Нехая ёсць, хаця іх не вельмі многа.

Такія вершы, як «Вяснянкі» ці «Чырвоны мак» і «Сонечнае лета», даказваюць, што Нехай можа стварыць добрыя лірычныя мініяцюры.

Удалыя мясціны ёсць у вершах «Зялёныя матывы», «Песні маці». Параўнанне гусей з белым пахмаркам, ці такі выраз, як «Помнік лету—на ўскраі сяла парыжэлыя селі стагі»— вельмі трапныя.

У замалёўцы пейзажа Нехай дасягае высокай эмацыянальнасці. Але зноў, такі цікавы верш, як «Па сонечных узгорках», псуецца радкамі: «Магутным маршам нашай пяцігодкі з-за чаго ёй (песні дзяўчыны— **К., А.**) угораць трактары».

Хочацца адзначыць яшчэ такія цікавыя вершы, як «Вяселле», «На палянку ляжыцца зярок».

Аднак паасобныя ўдачы ўсё-ж такі не выкупляюць усіх недахопаў зборніка.

Трэба сказаць, што недахопы Нехая—гэта не толькі яго недахопы, але недахопы пераважнай большасці маладых паэтаў. Зборнік Нехая павінен быць навучальным, як для самога аўтара, так і для другіх маладых паэтаў,—ён павінен быць прыкладам таго, як не трэба складаць зборнікі.

**А. КОРШАК.**
**М. АЎРАМЧЫК.**

# НОВЫ ТЭАТР

Рускі дзяржаўны тэатр у Магілеве існуе ўжо не першы год, ды і ў саставе яго калектыва ёсць нямала актораў, якія працавалі ў ім і ў мінулыя сезоны, але гэты тэатр з поўным правам можна назваць новым.

29 маладых актораў—выпускнікоў Ленінградскага тэатральнага вучылішча, улітых у Магілеўскі тэатр у 1939 годзе,—складаюць яго аснову. Гэта-ж вызначае не вельмі высокі ўзровень прафесіянальнага майстэрства спектакляў, якія тэатр паказвае цяпер гледачу. Але, ідучы на гэтыя «цяжкасці росту» маладога тэатра, мы будзем мець праз некаторы час сапраўдны творчы арганізм.

Рускі дзяржаўны тэатр БССР складаўся раней з выпадкова сабраных, нічым творча не аб'яднаных актораў. Стыль неахайнага, сугуба правінцыяльнага, ракеслонага спектакля ўкараніўся ў гэтым тэатры.

Выхаваная ў совецкай тэатральнай школе акторская моладзь, якая мае вялікае жаданне стварыць новы, творча цікавы тэатр, не магла адразу змяніць аснову Рускага тэатра. І дзеля гэтага трэба было ісці на часовае прымірэнне з нявопытнасцю калектыва, са спектаклямі, да якіх цяжка прад'явіць паўнату мастацкіх патрабаванняў.

У рэпертуары тэатра цяпер «Таленты і паклоннікі» Астроўскага «Каварства і любоў» Шыллера, «Змова» Вірта.

Першыя два спектаклі падрыхтаваны маладымі акторамі яшчэ ў вучылішчы, іх нам і давялося бачыць.

Праўда, школьныя спектаклі шліфаваліся ўжо ў Магілеве—пад кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка тэатра засл. арт. БССР Д. А. Орлова. На рад роляў уведзены выканаўцы з групы старых актораў тэатра. Трэба сказаць, што вопытныя акторы, якія засталіся ў тэатры са старога састава, дружна працуюць разам з моладдзю над стварэннем новага тэатра. Гэта—Орлоў, Аблоў, Обуховіч, Канаплянскі і інш.

Названыя вышэй спектаклі—школьныя работы. Адбітак вучнёўства ляжыць і на выкананні асноўных роляў, і на агульнай экспазіцыі спектакляў.

Арт. Кавалёва іграе Негіну ў спектаклі «Таленты і паклоннікі» з добрым тактам, зусім добра разумеючы вобраз і проста, шчыра трактуючы яго. Вядома, маладой артыстцы нехапае не толькі сцэнічнага вопыту, але, відаць, і жыццёвага, каб стварыць сапраўдны вобраз Негінай. Толькі ў асобных месцах яна па-сапраўднаму хвалюе. У яе ігры вельмі многа па-вучнёўску правільнага і мала сапраўдных чалавечых страсцей, мыслей і перажыванняў. Але ясна, што ў Кавалёвай сапраўднае акторскае будучае.

Зусім здавальняюча, калі гаварыць аб школьнай рабоце, справілася з роляю Домны Панцялееўны актрыса Баркан і ўсё-ж характар школьнай, эцюднай работы сказваецца ў адарванасці вобраза ад іншых вобразаў спектакля. Напрыклад, ва ўсім першым акце вы не адчуваеце клопатаў Домны Панцялееўны аб шчасці дачкі так, як яна гэта шчасце разумее. Усе паводзіны—напрыклад, яе сцэны з Нарокавым, з Велікатавым—не падпарадкаваны гэтай ніці, і яны атрымліваюць самадаўлеючае, адарванае ад спектакля гучанне. У апошнім-жа акце актрыса вядзе ролю яўна шаржыравана.

Гэтыя-ж асаблівасці сказваюцца і ў выкананні іншых роляў. Актор Сквірскі няроўна вядзе ролю князя Дулебава. Актор выпадае часам з умела, увогуле, створанага ім вобраза.

Зусім не ўдалася актору Кукісу роля Бакіна, яна засталася для яго чужой. Яму нудна іграць, гледачу нудна глядзець. Актор не знайшоў ніякай індывідуальнасці, жывых фарбаў у Бакіну, не ўбачыў у ім жывога чалавека.

Правільна намечан вобраз купчыка Васі акторам Мазіным. Толькі трэба больш сакавіта і ўпэўнена іграць яго. Скаванасць перашкаджае і актору Севрукову давесці добра намечаны ім вобраз Мігаева да яркага, поўнага ўвасаблення ўсяго таго, што напісана драматургам.

Акторы паказваюць толькі галоўныя рысы вобразаў, абмінаючы рад другарадных, якія і надаюць сцэнічнаму вобразу пераканальнасць праўды, тонкасць псіхалагічнага рысунка. Гэта датычыць і лепшых выканаўцаў у спектаклі, да ліку якіх безумоўна адносіцца актрыса Файбушэвіч, якая стварыла ўвогуле праўдзівы і пераканальны вобраз Смельскай.

Акторы Аблоў у ролі Нарокава, Канаплянскі ў ролі Велікатава стварылі цікавыя вобразы.

Актор Позін вельмі аднастайна і груба паказвае спіўшагася правінцыяльнага трагіка Эрнеста Грамілава.

Асобна трэба спыніцца на вобразе Мелузава. Малады актор Шкапскі стварае досыць цэльны, пераканальны вобраз (дрэнна толькі ён чытае апошні маналог, іменна—чытае маналог, дэкламіруе).

Выклікае, аднак, пярэчанні трактоўка вобраза. Чаму Мелузаў павінен быць фізічна непрыемным, не першай маладосці чалавекам?

Актор Шкапскі паказвае Мелузава злым, непрыемна-прамым, як-бы бястактна выхваляючымся сваёй праматой. Так, напрыклад, вырашана першая сцэна сустрэчы Мелузава з Велікатавым. Здаецца, што замест жывых чалавечых страсцей у Мелузава сухія маральна-этычныя догмы.

Мелузаў, які ў канцы пудоўнай драмы Астроўскага, у адказ на насмешлівыя заўвагі Бакіна, натхнёна кідае асярродзю Бакіных, Дулебавых, Смельскіх: — у нас з вамі і так дуэль, заўсёдны паядынак, безупынная барацьба—я навучаю, а вы разбэшчваеце, — гэты Мелузаў робіць п'есу па-асабліваму цікавай для нашага гледача.

Не паказваючы сур'ёзнасці перажыванняў і ўзаемаадносін Мелузава і Негінай, не накіроўваючы ў гэты бок эмоцый гледача, тэатр губляе адзін з асноўных ключоў да поўнага раскрыцця, ва ўсёй хвалюючай і павучальнай сіле, замыслу драматурга.

І ўвесь спектакль, і вобраз Негінай у тым ліку, становіцца больш бедным, сухім. Па сутнасці глядач не перажывае драмы Негінай, бо няма гэтай драмы ў спектаклі. Мелузаў—непаразуменне ў яе жыцці, а не глыбокая баразна, ад якой можна пайсці альбо ў адзін бок, альбо ў супрацьлеглы.

Рэжысёрам спектакля (іх, дарэчы, было шмат) можна выказаць яшчэ рад папрокаў. Чамусьці рашылі ажывіць спектакль вобразам Матроны, які заняў непрапарцыянальна многа месца.

Афармленне мастака Бельскага культурнае і выразнае. Шкада толькі, што культура выканання дэкарацый і мантыроўка ў тэатры далёка не на вышыні.

На спектаклі «Каварства і любоў» яшчэ больш, чым на «Талентах і паклонніках», сказваецца яго школьнае паходжанне. Строга гаворачы, гэта не спектакль у сапраўдным сэнсе слова. Няма адзінага творчага замыслу ў гэтым спектаклі. Няма прадуманай, прынцыповай канцэпцыі. Гэта сабраныя ў адно школьныя эцюды на тэму п'есы Шыллера.

Адсюль вялікі разнабой паміж асобнымі сцэнамі, у характары адных і тых-жа вобразаў у розных сцэнах.

Адсюль велізарная няроўнасць ігры ва ўсіх выканаўцаў. Моцныя мясціны ў Фердынанда чаргуюцца з дрэннай дэкламацыяй. Вурм бездапаможны ў першай палове спектакля і цікавы ў другой. Вельмі няўмела вядзе ролю лэдзі Мільфорд актрыса Чэмберг у самых адказных месцах, і ў той-жа час рад месц у ролі паказвае вялікія даныя актрысы, якія дазволяць ёй у будучым стварыць сапраўдны вобраз лэдзі Мільфорд.

Актор Сквірскі досыць цікавую схему вобраза фон-Кальба не змог напоўніць жыццём: атрымалася толькі схема, ды яшчэ утрыраваная, ад чаго вобраз набывае гучанне клаунады.

Непатрэбнае камічнае адценне надаецца актрысай Баркан вобразу маці Луізы. Відаць, тут заданне педагога, які намячаў характэрнасць вобраза, не стала плоцю сцэнічнай праўды, не ўрасло ў вобраз.

Многія выканаўцы гавораць тэкст, не толькі не рысуючы вобраз перад гледачом, але і не ўмеючы прымусіць яго проста слухаць сябе. Такі Міллер—Орынянскі ў пачатку спектакля.

Гэты спектакль паказвае толькі патэнцыяльныя магчымасці маладых актораў. Тое, што дасягнута імі ў гэтым спектаклі, яшчэ вельмі недасканалае. Але і Карнаухаў—Фердынанд, і Баркан, і Шкапскі, Чэмберг, і Сквірскі, і, зразумела, Кавалёва паказваюць, што ў калектыве шмат разнастайных акторскіх дараванняў.

Хочацца адзначыць яшчэ адну дзіўную асаблівасць спектакля: у месцах асабліва адказных і напружаных рэжысура ўводзіць музыку (да таго-ж вельмі дрэнную); акторы, імкнучыся перакрычаць музыку, напружана дэкламіруюць, сцэна прымае меладраматычнае адценне.

І ў гэтым спектаклі, як і ў папярэднім, рэжысура не можа пахваліцца добрым густам.

У тэатры ідзе напружаная, сур'ёзная работа. Рэпетыруюцца новыя спектаклі.

Ад спектакля да спектакля тэатр будзе расці, набываць свой самастойны творчы твар. І, бясспрэчна, праз некаторы час жыццёздольны калектыў створыць добры, культурны Рускі дзяржаўны драматычны тэатр БССР.

**М. ЮДЗЛЕВІЧ.**

Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР паставіў п'есу Гергеля і Літоўскага «Мой сын». **На здымку:** Сцэна з спектакля. Артыст М. Бярозкін у ролі Паўла і артыст І. Герман у ролі ваеннага следчага.

Фота І. Каплінскага.

## К. ГУБАРЭВІЧ

# ВОБРАЗ ПРАВАДЫРА НА ЭКРАНЕ

Сотні і тысячы прафесіянальных і непрафесіянальных мастакоў, скульптараў нашай краіны і ўсяго свету імкнуцца стварыць вобраз найвялікшага чалавека эпохі таварыша Сталіна ў яго максімальна-дакладным жыццёвым падабенстве. Але ніякае іншае мастацтва не валодае такой шчаслівай магчымасцю жыццёвага адлюстравання вобраза, як кіно. Мы маем на ўвазе, перш за ўсё, дакументальнае кіно.

Кожны год совецкія кінематаграфісты робяць здымкі таварыша Сталіна на святочных парадах, на пасяджэннях з'ездаў, сесій і інш. Штогодна мільённыя масы народа з хваляваннем сочаць за кожным рухам, усмешкай, жэстам правадыра прагна ўслухоўваюцца ў кожнае, поўнае найглыбейшага сэнсу, слова прамовы ці даклада таварыша Сталіна, знятага і запісанага на кінаплёнцы. З экрана глядзяць на гледача сталінскія вочы. Яны свецяцца розумам генія і ласкай чалавека з глыбокім і простым сэрцам.

Жыццёвы вобраз правадыра давяршаецца ў нашым уяўленні, калі мы слухаем яго словы. Народы нашай краіны добра памятаюць запісаны і зняты на кінаплёнку даклад таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі і выступленне на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі ў Маскве 11 снежня 1937 года. Тут слова зліваецца са знешнім аблічам і перад намі — магутны геній чалавецтва, перад намі Сталін ва ўсіх яго непаўторных знешніх і ўнутраных рысах.

Творчая думка совецкіх кінаработнікаў накіравана цяпер на вырашэнне складанай і вялікай задачы — на стварэнне мастацкага вобраза Сталіна. Патрэбен вельмі вялікі акторскі талент, каб сродкамі мастацтва паказаць вобраз таварыша Сталіна ва ўсім яго жыццёвым падабенстве.

Глядач ведае трох актораў, якія здолелі хоць у агульных контурах паказаць вобраз Леніна. Гэта Шчукін, Штраух і Мюфке. Над стварэннем вобраза таварыша Сталіна працавалі пакуль-што толькі два акторы: артыст Гольдштаб і артыст Гелавані. Прычым поспех іх работы быў не ва ўсім роўнацэнны. Калі Гелавані ўзброіўся большай творчай смеласцю, дык Гольдштаб быў больш стрыманым. Але абодва яны ўсё-ж не здолелі яшчэ паказаць вобраз Сталіна ва ўсім яго невымяральным аб'ёме, яго гістарычнай значымасці. Зроблена толькі першая спроба, зроблен пачатак вялікай і ўдзячнай работы, якая павінна закончыцца стварэннем найвялікшага ў свеце чалавечага вобраза.

Тым не менш у гэтых, магчыма, пакуль нясмелых спробах, ужо вырысоўваюцца контуры і грані мастацкага вобраза таварыша Сталіна.

Ва ўсіх пяці фільмах («Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Чалавек з ружжом», «Вялікае зарава», «Выбаргская старана»), у якіх у той ці іншай меры паказан вобраз таварыша Сталіна, акторы, пастаноўшчыкі і аўтары самай яркай лініяй правялі адну надзвычай важную і характэрную для таварыша Сталіна асаблівасць: вялікую любоў да свайго друга і настаўніка В. І. Леніна.

Хто не памятае хвалюючага эпізода з карціны «Ленін у Кастрычніку», калі ўдзельнікі гістарычнага пасяджэння Цэнтральнага Камітэта, вырашыўшага пытанне аб узброеным паўстанні, разыходзіліся па дамах. Таварыш Сталін інструкціруе рабочага Васілія:

— «Таварыш Васілій, майце на ўвазе: без спецыяльнага рашэння ЦК Владзімір Ільіч не павінен выходзіць на вуліцу... Вы адказваеце перад партыяй за яго жыццё».

Жыццё Владзіміра Ільіча для таварыша Сталіна было свяшчэннай каштоўнасцю, якой ніхто не меў права распараджацца, апрача партыі. Калі здраднікі партыі патрабавалі ў 1917 годзе гласнага суда над Леніным, нібы ў імя выратавання рэволюцыі («Вялікае зарава»), Сталін даў ім рэзкі адпор:

— «Трэба памятаць і ніколі не забываць, што такога другога Леніна ў нас няма... Я прызнамсі ў гісторыі чалавецтва другога такога не памятаю... А таму нікому не дазволена распараджацца яго галавою, апрача партыі...»

У самыя крытычныя мінуты, калі шпіёны Керанскага абнюхвалі ў Петраградзе кожны дом, шукаючы Владзіміра Ільіча, — Ленін, па рашэнню партыі, хаваецца ў Разліве. Таварыш Сталін пільна ахоўвае канспірацыю і ў патрэбную мінуту сам бярэ ў свае рукі руль рэволюцыі. Сталін сам праводзіць партыйны сход, на якім разграмляе прымазаўшыхся здраднікаў, сілай жалезнай логікі даказвае неабходнасць узброенага звяржэння ўрада Керанскага («Вялікае зарава»). З гэтай-жа карціны цікава прывесці наступны эпізод: былы франтавы салдат Ершоў трымае сувязь між Сталіным і Леніным, які знаходзіцца ў Разліве. Ершоў прыходзіць к Леніну з інфармацыяй аб рабоце з'езда, які праводзіць Сталін.

— Так... Значыць, з'езд ідзе? — пытаецца Ленін.

— Як пры вас, — адказвае Ершоў.

— Безумоўна. Такі выдатны рулявы, як Сталін, павядзе проста к мэце, — пацвярджае Владзімір Ільіч. Гэта выключна характэрная рыса ў карціне, раскрываючая адносіны Леніна к Сталіну.

Ні ў адным кадры з пяці згаданых карцін нельга знайсці ніводнага слова простага прызнання ў дружбе і любві двух тытанаў эпохі, але ў кожным кадры, дзе толькі паяўляецца Ленін ці Сталін, глядач адчувае, да чаго глыбокая і моцная іх дружба. Гэта дружба праверана часам, умацавалася ў барацьбе за рэволюцыю.

Ленін давярае Сталіну, як давярае настаўнік лепшаму і праверанаму свайму вучню, які стаў незамяніімым памочнікам і гарачым паследавацелем. Як толькі Ленін прыехаў з Фінляндыі ў Петраград («Ленін у Кастрычніку»), першым жаданнем яго было — пабачыць Сталіна. Мы не бачым іх сустрэчы, мы не прысутнічаем на гістарычнай чатырохгадзіннай гутарцы іх, якая вырашыла лёс рэволюцыі. Але вось, пасля надпісу: «Чатыры гадзіны працягвалася гутарка Леніна са Сталіным», у кадры паяўляюцца Ленін і Сталін, — кожнаму ясна, што Сталін быў адзіным для Леніна чалавекам, з якім ён раней параіўся і распрацаваў план далейшага рэволюцыйнага дзеяння, перш чым паставіць гэта пытанне на Цэнтральным Камітэце. Ленін глыбока давяраў Сталіну і ў самыя цяжкія для рэволюцыі мінуты даручаў яму вырашаць выключна складаныя задачы. Так, у рукі Сталіна Леніным быў уручан царыцынскі фронт, які распадаўся пад ударамі дзенікінскіх полчышчаў і здрадніцтва Троцкага.

Фільм «Ленін у 1918 годзе» выдатна паказвае гістарычную ролю таварыша Сталіна ў аднаўленні царыцынскага фронта, які адыграў, як вядома, рашаючае значэнне ў канчатковым разгроме белагвардзейскіх полчышчаў. Таварыш Сталін знаходзіць на царыцынскім фронце прадажных ваенспецаў, стаўленікаў Троцкага, якія падрыхтавалі планы адступлення чырвоных часцей і пачалі здаваць пазіцыі. Жалезная рука Сталіна спыніла адступленне, таварыш Сталін абясшкоджвае здрадніцкі загад Троцкага рэзалюцыяй «Не прымаць пад увагу. Нарком І. Сталін». Крывавыя замыслы Іуды-Троцкага былі разгаданы і разгромлены.

Прадажныя ваенспецы былі бязлітасна выкінуты са штабаў. З упэўненасцю, уласцівай геніяльнаму палітычнаму дзеячу і ваеннаму стратэгу, Сталін прызначае на пост камандзіра дывізіі таленавітага радавога байца Пералаава.

«— Ну, віншую вас, таварыш Перахаў, з новым прызначэннем...

— Дзякуй, таварыш нарком. Толькі баюся, ці спраўлюся я, таварыш нарком. Гэта ўсё-такі дывізія.

— Нічога... З іменем Леніна ў сэрцы вы заўсёды пераможаце».

Уменне бачыць каштоўнае ў чалавеку, вылучыць яго, падтрымаць у ім упэўненасць у сваіх сілах — яшчэ адна характэрная рыса ў вобразе таварыша Сталіна, ярка і таленавіта раскрытая ў некаторых карцінах.

У фільме «Чалавек з ружжом» Сталін, са згоды Леніна, прызначае камандзірамі палка франтавога салдата Шадрына і рабочага-чырвонагвардзейца Чыбісава.

**Сталін:** Як вы мяркуеце, таварыш камандзір, ці здолееце вы апраўдаць давер'е рабочых?

**Шадрын:** Гатоў памерці.

**Сталін:** Ну, навошта-ж так адразу і паміраць, нам-бы цяпер толькі і пажыць. Смерць справа выпадковая, мы лепш давайце аб жыцці будзем думаць... Райцеся, дапамагайце адзін аднаму. Аб людзях думайце, клапаціцеся аб іх... І яшчэ адна парада, таварышы, беражыце як зрэнку вока наш свяшчэнны саюз рабочых і сялян. Гэтаму нас навучае найвялікшы і лепшы чалавек нашай эпохі — таварыш Ленін.

Іменем Леніна Сталін натхняўся, натхняў і натхняе масы, з іменем Леніна ён вядзе краіну да новых і новых перамог. Так паступова, з паасобных рысаў, учынкаў і дзеянняў совецкая кінематаграфія заклала аснову стварэння вобраза найвялікшага ў свеце чалавека, і ўсе лепшыя творчыя імкненні работнікаў кіно накіраваны зараз к таму, каб стварыць гэты вобраз ва ўсёй яго гістарычнай велічы. Будуць створаны фільмы аб дзіцячых і юнацкіх гадах, фільмы аб мужнай барацьбе таварыша Сталіна з царскай рэакцыяй і, нарэшце; будуць створаны палотны аб гадах соцыялістычнага росквіту нашай краіны, аб гадах геніяльнага сталінскага кіраўніцтва творчай работай народаў па пабудове комунізма. Стварыць усё гэта як мага хутчэй — справа гонару нашых кінематаграфістаў і ўсёй совецкай кінематаграфіі.

# АБ ВЕРШАХ НІНЫ ТАРАС

Чалавек, ператвораны воляю памешчыкаў і паноў у раба, ахоплен безвыходным горам і сумам.

Гэта гора прыгнечанага чалавека і заключаецца ў вершах Ніны Тарас.

Лёгка ўздыхнулі у полі вятры,
Сонца ясней узышло, як учора...
Жаўранак недзе у хмарах развеяў
Звонкае гора.

І звініць гэта гора над краінай, сплываючай крывёю, над краінай жабрацкай і абяздоленай — над Заходняй Беларуссю.

Араты ідзе за сахой, знясілены голадам і холадам. Як выглядае гэты араты, аб чым думае ён?

За баразною ішоў аратай,
Ціха на коніка нукаў.
Можа не цяжка, а неяк спіна
Гнулася крукам.
Думаў пра хату, што хлеба няма,
Хоць за стол дзеткі паселі...

Селянін думае аб тым, «што хлеба няма», што «дзеці за стол паселі», а на стале пустая міска і маці, знясіленая голадам і высушаная журбою аб лёсе сваіх дзяцей, «на пальцах худых да жніва лічыць нядзелі».

Прачытайце гэтыя радкі, і вы ўбачыце аратая, згорбленага над сахою, вы ўбачыце яго сям'ю, якая сядзіць за сталом вакол міскі, напоўненай «трын-травою», вы ўбачыце маці, бедную маці, якая крывёю плача аб лёсе сваіх голых і галодных дзяцей.

Тыя-ж матывы народнага гора пакладзены і ў аснову вершаў «Хоць позна ўжо...», «За кудзеляй», «На новы год», «На бруку» і іншых, з той толькі розніцай, што ў іх ужо намячаецца пераход да пратэсту супроць панскага прыгнёту. Пратэст выражаецца ці ў маўклівым абурэнні, вызваным гневам, які закіпае і накапліваецца ў грудзях, чалавека-раба, ці ў адкрытым папярэджанні прыгнятальнікам, якое гучыць як заклік да супраціўлення панам...

Дзяўчына ідзе па роднай краіне. Ці то рэчкі цурчаць, ці птушкі пяюць, ці шапчуць травы — усе яны вядуць гутарку «аб нечым знаным». І вось у сэрцы дзяўчыны нарастае песня, толькі заспяваць яе нельга і гучыць гэта песня без слоў. Дзяўчына хавае заветную мару, што:

Другі мо' раз калісь прыпомню зноў
пра гэты збуджаны напеў.

Такі змест верша «Хоць позна ўжо...». У ім выражаны мары чалавека аб лепшым будучым. Чытач разумее сум дзяўчыны, перажывае яго.

Ніна Тарас — паэтэса вельмі наглядальная. Тэмы яе вершаў разнастайныя. Побач з паказам жыцця сялян, яна не мінае і цёмных захалусных куткоў горада, дзе ў гразі і жабрацтве гінулі тысячы рабочых, аддаваўшых за грошы свае сілы.

Беспрацоўная з дзіцём, быццам ліст
сарваны,
Жоўтая ў лахманы пад сцяной
сядзела.
Галаву схіліла ніжай, як прад панам,
Хіба можа болей есці не хацела?
І ніхто не бачыў, як пішком
сканала.
Ды нашто галодным заглядаць
у вочы?

Толькі потым вецер скавытаў нямала
Сярод неспакойнай і асенняй ночы.

Толькі вецер і больш ніхто, таму што такіх смерцяў было тысячы, таму што людзі прывыклі бачыць такія смерці, прывыклі праходзіць моўчкі, не заглядаючы галодным у вочы.

Самае апісанне смерці беспрацоўнай гучыць гарачым пратэстам супроць існуючага ладу. Ужо адно тое, што Ніна Тарас смелай кісцю мастака нарысавала праўдзівую карціну з жыцця рабочых, — не заслуга.

Але найбольш адкрыта выказан пратэст паэтэсай у вершы «На новы год».

Надышоў новы год. Можа ён прынясе з сабою і новае жыццё? Можа знойдзецца работа? Так гаворыць дзяўчына, звяртаючыся да маці, і тут-жа кідае смелы выклік панам:

За кусок з мякінай хлеба
Ласкі іх прасіць не будзем.
Маці, плакаць больш не трэба,
Надрываць старыя грудзі!

Не слёзы патрэбны, а барацьба, бязлітасная і крывавая, барацьба за права жыць, за права есці, за права працаваць.

Гэта былі мары дзяўчыны. але гэтыя мары збыліся: новы год прывёў Чырвоную Армію, армію-вызваліцельніцу. Агнём і мечам змяла гэтая армія польскую шляхту, вярнула зямлю яе сапраўдным гаспадарам — сялянам, вярнула заводы іх сапраўдным гаспадарам — рабочым.

Не будзе больш галодных дзяцей і знясіленых голадам матак, не будзе беспрацоўных, паміраючых пад сценамі, не будзе катаржнай паднявольнай працы.

Светлыя шляхі да шчасця ляжаць перад народам Заходняй Беларусі, якая ўлілася ў склад БССР. Светлыя шляхі да творчасці на карысць савецкай радзімы, на карысць савецкага народа ляжаць перад таленавітай паэтэсай Нінай Тарас. Ідучы па гэтых шляхах, яна мастацкім словам, поўным цеплыні і праўды, дапаможа вызваленаму народу будаваць сваё новае шчаслівае жыццё.

К. ЦІТОЎ.

## ЛІТАРАТУРНАЯ ХРОНІКА

У Мінск прыехала група пісьменнікаў з заходніх раёнаў Беларусі. У складзе групы: беларускі паэт Максім Танк, вядомая польская дзіцячая пісьменніца Яніна Бранеўская, яўрэйскі празаік Э. Каганоўскі, польская пісьменніца Е. Сельм, беларускія паэты Ніна Тарас і Мікола Засім, яўрэйскія пісьменнікі Лейвар-Вольф і Зільбург.

Прыехаўшыя пісьменнікі знаходзяцца зараз у Пухавічах у Доме творчасці ССПБ.

У Беласток і іншыя гарады заходніх абласцей БССР выехала брыгада пісьменнікаў у складзе тт. З. Аксельрода, А. Астрэйкі, М. Галоднага, М. Грубіяна, А. Куляшова, А. Кучара. Пісьменнікі правядуць рад літаратурных вечароў у Беластоку, Гродне, Баранавічах, Брэсце і іншых гарадах.

# НА ПАРТЫЙНЫМ СХОДЗЕ

Днямі партыйная арганізацыя саюза савецкіх пісьменнікаў БССР на сваім адкрытым сходзе падагульвала вынікі ўдзелу партарганізацыі і саюза савецкіх пісьменнікаў у кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Даклад па гэтаму пытанню тав. Модэля выклікаў ажыўленае абмеркаванне. Характэрнай рысай удзелу пісьменнікаў у апошняй выбарчай кампаніі з'яўляецца тое, што замест напісання вершаў, прысвечаных выбарам у Советы, і нарысаў пра кандыдатаў у дэпутаты, у агітацыйна-масавай рабоце на выбарчых участках асабіста ўдзельнічалі ўсе пісьменнікі саюза.

Значная частка беспартыйных пісьменнікаў упершыню была вылучана агітатарамі, даверанымі, членамі і старшынямі ўчастковых і акруговых выбарчых камісій.

Дружная работа комуністаў і непартыйных пісьменнікаў забяспечыла бліскучыя поспехі партыйна-масавай, агітацыйна-прапагандысцкай работы на ўчастках. Аб гэтым красамоўна сведчыць 100-працэнтнае, аднадушнае галасаванне працоўных за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Практыка работы на выбарчых участках паказала, як трэба вылучаць, вырошчваць і выхоўваць актыў.

За час выбарчай кампаніі выраслі новыя людзі, якія на штодзённай практычнай рабоце паказалі свае арганізацыйныя, творчыя і агітацыйна-прапагандысцкія здольнасці.

Партыйная арганізацыя адзначыла актыўную работу паэта-ордэнаносца тав. Пятро Глебкі. Тав. Глебка працаваў старшынёй участковай выбарчай камісіі. Ён быў захоплены даручанай яму надзвычай адказнай работай і праявіў выключныя здольнасці і ўменне па арганізацыі работы на выбарчым участку.

Партарганізацыя таксама адзначыла добрую работу тав. А. Кучара, які працаваў давераным у акрузе, дзе дэпутатам Мінскага гарадскога совета выбран народны паэт рэспублікі Янка Купала. Станоўчыя прыклады работы тав. А. Кучара былі рэкамендаваны Сталінскім райкомам партыі другім давераным.

З вялікай стараннасцю штодзённа працаваў Х. Шынклер у якасці даверанага ў акрузе, дзе дэпутатам Мінскага гарадскога совета выбран пісьменнік-ордэнаносец Міхась Лынькоў.

Тав. Шынклер арганізаваў рад цікавых літаратурных вечароў, сустрэч выбаршчыкаў са сваім кандыдатам, наладзіў работу з хатнімі гаспадынямі.

Добрых поспехаў у сваёй рабоце дабіліся А. Якімовіч, Э. Каган, якія працавалі даверанымі ў акругах, дзе дэпутатамі Сталінскага райсовета выбраны пісьменнік Кузьма Чорны і Уры Фінкель, а таксама Г. Бярозкін, які працаваў даверанымі ў акрузе, дзе дэпутатам Мінскага гарадскога совета выбран пісьменнік-ордэнаносец Змітрок Бядуля.

Рад таварышаў—Праўдзін, Гусеў, Мазо, Грубіян—з'яўляліся лепшымі агітатарамі на ўчастках, а т.т. Калачова і Ялава — прыкладнымі членамі выбарчых камісій.

Выступаўшыя па дакладу тав. Модэля гаварылі аб тым, што непасрэдная работа ў масах узбагаціла пісьменнікаў вопытам жыцця, садзейнічала іх творчай рабоце.

У сваім выступленні паэт-ордэнаносец Пятро Глебка прасіў партыйную арганізацыю замацаваць яго на былым выбарчым участку для далейшай работы ў якасці агітатара.

Адзначаючы добрыя вынікі работы пісьменніцкага калектыва ў выбарчай кампаніі, рад пісьменнікаў — А. Кучар, П. Глебка, М. Паслядовіч, І. Гурскі — у сваіх выступленнях выказвалі думку, што мы можам з такой-жа дзелавітасцю, з такім уздымам і энергіяй узяцца за наладжванне ўнутрысаюзнай работы ў пісьменніцкай арганізацыі.

Клуб саюза пісьменнікаў ператвораны ў прыбытковае прадпрыемства. Ён сістэматычна здаецца ў арэнду розным установам. Ні адна секцыя ў саюзе не працуе. Праўленне ССПБ надта захапілася стварэннем розных камісій. У апошнія часы амаль па кожнаму пытанню, якое абмяркоўваецца на пасяджэнні праўлення, ствараюцца камісіі. Дарэчы, іх створана столькі, што пісьменнік не ведае, у якой-жа ён урэшце камісіі. яму часам мала клопату да гэтага, бо ўсёроўна ніводная з іх не працуе. Усё гэта вынік бяспланавасці і неарганізаванасці работы праўлення. Нездарма на гэтым-жа сходзе па дакладу тав. Рудзько аб рабоце мясцкома пісьменнікі адзначылі, што і апарат саюза працуе ненармальна, няма належнай працоўнай дысцыпліны, адсутнічае распарадчыцельнасць.

Трэба, урэшце, сур'ёзна ўзяцца за наладжванне ўнутрысаюзнай творчай работы, неабходна падтрымаць добрую ініцыятыву рада пісьменнікаў.

Алесь СТАХОВІЧ.

# Г. І. ПАВАРЫЧ

Пасля доўгай і цяжкай хваробы ў Новабеліцы, на 27 годзе жыцця, памёр таленавіты скульптар-самавучка Георгій Іванавіч Паварыч.

Г. І. Паварыч нарадзіўся ў Новабеліцы, у сям'і рабочага, і ўсё сваё кароткае жыццё пражыў у родным горадзе. Ён быў настаўнікам, але з прычыны хваробы прымушан быў кінуць працу настаўніка. Будучы цяжка хворым, Г. І. Паварыч аддае свае апошнія сілы скульптурнай творчасці. Ён нідзе не вучыўся пластычнаму мастацтву, але, валодаючы прыроднай наглядальнасцю, з пахвальнай для скульптара-самавучкі граматнасцю і percanaўчасцю творыў свае вобразы.

Да ліку лепшых сярод першых работ Г. І. Паварыча трэба аднесці партрэт маці. У гэтым партрэце мастаком-самавучкай дасягнута вялікая анатамічная граматнасць, уменне правільна і дакладна перадаваць паказваемую натуру. Партрэт гэты не раз экспаніраваўся на выстаўках народнай творчасці.

Заслугоўвае быць адзначаным і выкананы Г. І. Паварычам кампазіцыйны партрэт пісьменніка Н. Астроўскага. Скульптар-самавучка глыбока любіў гэтага пісьменніка-большавіка, прыклад мужнага жыцця якога натхняў яго на барацьбу з хваробай і на працу.

Скульптара-самавучку захапляў таксама і вобраз вялікага паэта і грамадзяніна А. С. Пушкіна. Ён выляпіў яго партрэт. Пазней Паварыч стварае кампазіцыйны партрэт В. І. Леніна, імкнучыся паказаць Леніна, як бязлітаснага змагара супроць ворагаў пралетарскай рэвалюцыі.

Мужна змагаючыся з хваробай, прадаўжаючы нястомна працаваць, Г. І. Паварыч стварае вялікую, амаль трохметровую, алегарычную скульптуру «Перамога». Г. І. Паварыч выляпіў магутнага юнака, поўнага прагі барацьбы і подвігу. Юнак стаіць на скале ў акружэнні горных арлоў. Гэты алегарычны вобраз выклікае ў гледача асацыяцыю з легендарным Праметэем, вызваленым ад ланцугоў і зноў гатовым да барацьбы за шчасце чалавецтва. Створаны скульптарам-самавучкай вобраз, няхай некалькі і ўмоўны, хвалюе гледача мужнасцю і перамогай чалавечага розуму і сілы над сіламі прыроды і нягодамі жыцця. Гэта гімн перамозе жыцця, а мы можам сказаць—і перамозе тых вялікіх духоўных і творчых сіл, якія жылі ў сэрцы таленавітага скульптара-самавучкі.

Прыклад жыцця і творчасці Г. І. Паварыча заклікае мастакоў Савецкай Беларусі да дзярзанняў і барацьбы ў імя квітнення сваёй соцыялістычнай радзімы.

А. ДАЛІН.

Студыя «Мосфільм» закончыла вытворчасцю фільм «Паднятая цаліна» паводле рамана М. Шолахава. На здымку: Бадр з фільма. Артыст В. Дарафееў у ролі дзеда Шчукара.

Фота-кліше ТАСС.

# НА ПАСЯДЖЭННІ ПРАЎЛЕННЯ ССПБ

У канцы снежня 1939 года адбылося пашыранае пасяджэнне праўлення ССПБ.

Па пытанню далейшай работы з пісьменнікамі заходніх абласцей Беларусі выступіў тав. Клімковіч. Ён адзначыў, што ў заходніх абласцях БССР выяўлена звыш 100 пісьменнікаў, уключаючы пачынаючых. Большасць іх знаходзіцца ў Беластоку. Значная частка пісьменнікаў працуе ў рэдакцыях газет і культурна-асветных установах. У Беластоку заканчваецца абсталяванне Дома пісьменніка.

Але пісьменнікі ў заходніх абласцях яшчэ не ўсе выяўлены. Мала зроблена і для знаёмства з тымі пісьменнікамі, якія ўжо вядомы. Трэба наладзіць выданне твораў беларускіх, яўрэйскіх і польскіх пісьменнікаў, пражываючых у заходніх абласцях БССР.

У спрэчках па інфармацыі тав. Клімковіча выступілі т.т. З. Аксельрод, М. Лынькоў, Я. Колас. Праўленне пастанавіла паслаць у заходнія абласці БССР дзве брыгады для праводжання работы з пісьменнікамі і арганізацыі на буйных прадпрыемствах і ў гарадах літаратурных вечароў. Праўленне пастанавіла таксама паслаць у Дом творчасці саюза пісьменнікаў БССР у Пухавічах М. Танка, Н. Тарас, М. Засіма, Ф. Пестрака, А. Іверса, Я. Бранеўскую, М. Машара і інш. У студзені намечана правесці ў Мінску літаратурныя вечары Максіма Танка і Філіпа Пестрака.

Праўленне саюза абмеркавала прапанаваныя тав. А. Кучарам мерапрыемствы па пасмертным выданні твораў Эдуарда Самуйлёнка. У спрэчках прынялі ўдзел т.т. М. Клімковіч, В. Вольскі, Я. Колас.

Вырашана выдаць поўны збор твораў Эд. Самуйлёнка і падрыхтаваць альманах, прысвечаны яго памяці. Уся работа па падрыхтоўцы і зборы рукапісаў нябожчыка для поўнага збору твораў даручана тав. Р. Мурашку, а падрыхтоўка біяграфіі Самуйлёнка — тав. В. Вольскаму.

Для збору рукапісаў і падрыхтоўкі выдання твораў нябожчыка М. Дзехцяра створана камісія ў складзе т.т. У. Фінкеля, З. Аксельрода і Г. Бярозкіна. Праўленне даручыла таксама тав. Г. Бярозкіну сабраць і прыняць ад сваякоў усе рукапісы памёршага паэта Алеся Гурло.

Для арганізацыі святкавання стагоддзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка Францішка Багушэвіча створана камісія ў складзе т.т. Я. Коласа, К. Чорнага, П. Глебкі, В. Барысёнка і І. Гурскага. Камісіі даручана дамовіцца з Дзяржаўным выдавецтвам аб выданні твораў Ф. Багушэвіча.

На гэтым-жа пасяджэнні была заслухана інфармацыя тав. М. Клімковіча аб рабоце абласной палескай брыгады пісьменнікаў і інфармацыя тав. Л. Каповіча аб прыцягненні пісьменнікаў да работы ў кіно.

Праўленне ССПБ стварыла камісію па правядзенню дзесяцігоддзя з дня смерці В. Маякоўскага. У склад камісіі вылучаны т.т. П. Броўка, Г. Бярозкін, Р. Лынькоў, М. Клімковіч і З. Аксельрод.

На гэтым-жа пасяджэнні было разгледжана пытанне аб прыёме ў члены саюза пісьменнікаў БССР Анатоля Астрэйкі і Канстанціна Цітова. У спрэчках аб творчасці тав. А. Астрэйкі выступілі т.т. А. Кучар, Г. Бярозкін, К. Чорны, М. Клімковіч, З. Аксельрод, А. Якімовіч і М. Лынькоў. Усе яны адзначылі, што за апошні час тав. Астрэйка творча вырас, паказаў сябе як растучы і здольны паэт. Выступаўшыя таварышы, аднак, папярэдзілі тав. Астрэйку аб небяспецы скатвання к бытавізму і схематызму. Праўленнем ССПБ тав. Астрэйка аднагалосна прынят у члены саюза пісьменнікаў БССР.

Наступнай была разгледжана заява тав. Цітова. Аб творчасці К. Цітова зрабіў інфармацыю П. Глебка. Тав. Глебка адзначыў, што тав. Цітоў здольны паэт. Асноўная тэма К. Цітова — абарона радзімы. Вершы яго простыя і задушэўныя.

Праўленне ССПБ аднагалосна прыняло тав. Цітова ў члены ССП БССР.

## У рускай секцыі ССП БССР

6 студзеня ў Доме пісьменніка малады празаік Б. Зубец чытаў сваё новае апавяданне «На дачы». У абмеркаванні прынялі ўдзел тт. Е. Садоўскі, І. Гурэвіч, А. Кучар, А. Куляшоў, Г. Бярозкін, З. Целесін і К. Цітоў. Амаль усе выступаючыя адзначылі побач з цэлым радам задатных вартасцей маладога аўтара, якімі з'яўляюцца пачуццё юмару, уменне карыстацца прыватнай дэталлю, таксама асноўны недахоп тав. Зубца — адсутнасць ідэйнай глыбіні, павярхоўны погляд на жыццё, падуладнасць неаднаразова выкарыстаным у літаратуры сюжэтам і калізіям.

Абмеркаванне прайшло ў дзелавой атмасферы, не гледзячы на тое, што кіраўніцтва рускай секцыі ССПБ мала паклапацілася аб добрай арганізацыі чыткі і абмеркавання.

Г. БЯРОЗКІН

# АБ ПЕРШАЙ КНІЗЕ

Аб гэтым трэба было-б сказаць проста і чэсна, без абінякоў і без уважлівых рэверансаў: у нашай маладой паэзіі справы стаяць не зусім добра. Высокая паэтычная страсць і пафас, якія адрозніваюць нашу савецкую паэзію ў яе лепшых узорах, зніжаецца ў цэлым радзе вершаў пачынаючых вершатворцаў да ўзроўню бясконцага паўтарэння нейкіх нежывых копій з аднаго «прыбліэнага», заляжалага вершавага трафарэту. Узровень патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да маладых паэтаў, яшчэ не даволі высокі і ў выніку нашы журналы і газеты наводнены патокам такіх вершаў, якія ўтвараюць самае прыгнечваючае ўражанне на ўсіх, зацікаўленых у росце нашай паэзіі, паняццях у ёй свежасць і самастойнасць мыслі, актыўную палітычную мэтанакіраванасць, навізну і дзейснасць верша.

Творчая энергія паэта павінна быць накіравана на тое, каб сваімі ўласнымі словамі, незатрапанымі і незацятанымі, «з сэрца зробленымі, а не з ваты» (Маякоўскі) выразіць і выказаць самае заветнае і дарагое.

У кожнай новай кнізе вершаў, ці то маладога, ці то спелага паэта, мы перш за ўсё шукаем гэтай накіраванасці. Адсутнасць яе і прымушае адносіцца недаверліва да вельмі многіх вершаў, якія друкуюцца ў нашых газетах і журналах.

У іх мала самастойных і свежых замыслаў, мала асабістай назіральнасці, мала сапраўднага лірычнага хвалявання, чыстага і не затаптуджанага «агульнапрынятымі» паэтычнымі штампамі.

Маладыя паэты вельмі мала клапоцяцца аб тым, каб выйсці за межы трафарэтнага авалодання тэмай. Яны паўтараюць адзін другога ў словах, у сюжэтах і вобразах. Прагледзьце вершы нашых маладых паэтаў за апошнія два гады і вы заўважыце, што добрая палова гэтых вершаў напісана па лірычнай схеме: малады пагранічнік едзе на граніцу, а ў родным сяле яго чакае нявеста. Прачытаўшы адзін верш на гэту тэму, вам няма чаго чытаць другі верш. У вершах, зробленых па гэтаму трафарэту, вы заўсёды знойдзеце ў адных устойлівых суадносінах і пафас, і сум, і пейзаж, і радасць, і каханне,—адным словам, усё тое, што ў агульнай складанасці і ўзаемаадносінах павінна стварыць бачнасць перамагання схемы, ілюзію сапраўднага жыцця. Але гэта толькі ілюзія, прыгнечваючая сваёй фальшай і схематызмам. Прачытайце большасць падобных вершаў і вас перш за ўсё здзівіць інтанацыя бязволля, якая гучыць у гэтых вершах, адсутнасць зацікаўленага погляду на жыццё, ложная абаяльнасць старых раманеавых штампаў, пад уладай якіх знаходзяцца маладыя паэты.

Яшчэ няма ў нашай маладой паэзіі (за выключэннем нямногіх імён — П. Панчанкі, А. Дзергая, Л. Гаўрылава) жадання гаварыць сваім уласным голасам. Яшчэ не адчуваецца беражлівых, працоўных і эстэтычных адносін да паэтычнай формы, як да сродку пазнаць рэальны свет у яго канкрэтнай і пачуццёвай адчувальнасці. Наадварот, яшчэ пераважаюць прынцыпяльна-абыякавыя адносіны да слова, да паэтычнай тэхнікі, як да нечага ганебнага і заведама фармалістычнага. І на старонкі нашага друку вельмі часта трапляюць вучнёўскія вершы:

Моцна цісну ў руках
Трохлінейку я,
Сталь халоднага курка
Грэе кроў мая. (М. Дзядзюля).

Ці:

Узлёт рытмічны рук і ног,
Лёгка дышуць грудзі.
Пойдуць ворагі вайной—
Баранішча будзем. (М. Жук).

Вялікую школу прынёс нашай маладой паэзіі агульнапрыняты тон ветлівай спагадлівасці, з якім часцей за ўсё звяртаюцца да маладых паэтаў. Вось, напрыклад, тав. Я. Казека ў сваім артыкуле аб маладзёжнай літаратуры («Полымя рэвалюцыі» № 10, 1938) замест з'едлівай, няхай і строгай размовы з маладым пісьменнікам праціскае нейкае святочнае шапыраванне па маладзёжнай літаратуры «Алесь Бачыла—адзін са здольных беларускіх паэтаў. Ён напісаў рад добрых аптымістычных вершаў, якія характарызуюцца навізной сваёй тэматыкі, глыбокай ідэйнай накіраванасцю...» Аб чым думаць Бачыла праць ўшы такі водгук аб сабе? А ён-жа пакуль яшчэ вельмі нясмела і няўпэўнена ставіць свае крокі! Відавочна, аб гэтым яму належала сказаць. Для прыкладу можна было-б прывесці яго-ж верш «Грузінка», у якім Бачыла зусім па-вучнёўску капіруе гатовыя формулы пушкінскага верша, механічна дапасоўваючы іх да новай тэмы:

Як вобраз мілай прастаты.
Чорнавалосая грузінка...

Да ўсяго гэтага крытыку няма справы. Нішто не павінна парушыць спакой яго бестурботнага шпацыравання з кветкай у данкане. Ад такіх шпацыраванняў праста школа паэтам і паэзіі...

Мы гаворым аб усім гэтым зусім не выпадкова. Нядаўна выйшлі з друку два зборнікі маладых паэтаў Г. Нехая і А. Гейне і ў нас ёсць повад аднавіць спыненую гутарку аб маладой паэзіі, аб шляхах яе развіцця і росту.

Перш за ўсё—аб самастойнасці, аб самабытнасці. Мы звяртаемся да паэта, які выдае сваю першую кнігу: ты малады, табе дваццаць год, ты вучышся, працуеш, кахаеш, весялішся і пішаш вершы. Паглядзі на свет свежымі, не стомленымі вачыма і аб гэтым напішы. І мы даруем табе, калі ў тваіх вершах будуць сырыя радкі, недапрацаваныя строфы, толькі-б у іх была твая душа, твой пункт гледжання на свет, твая ўсхваляваная зацікаўленасць тым, што адбываецца на зямлі.

Так мы гаворым маладому паэту і ўспамінаем словы Л. Н. Талстога:

«Пісьменнік, які не мае яснага, акрэсленага і новага погляду на свет, і тым больш той, які лічыць, што гэтага нават не трэба, не можа даць мастацкага твора».

І нас зусім не радуюць, а, наадварот, засмучаюць кнігі вершаў, у якіх няма гэтага самастойнага пункту гледжання. Такія кнігі проста не патрэбны.

Вось невялічкая кніга пачынаючага паэта А. Гейне «Шчаслівая зорка». У ёй ні аднаго радка ад паэта, ад яго асабістай назіральнасці. Усё, аб чым піша Гейне, добра знаёма з другіх вершаў, з газетных артыкулаў і нарысаў.

Вось цэлых пяць вершаў, аб'яднаных адным загалоўкам «У дазоры». Цэлы рад месц гэтага цыкла напісан самай звычайнай беспрагляднай прозай:

Толькі-толькі прыехаў з пабыўкі
Карацупа. На сход ён заходзіць.
Чуе слоў віншавальных абрыўкі,
Дазнаецца аб узнагародзе
І не верыць вушам сваім нават...

Ці:

У часць прыслалі данясенне,
К сабе Нікіту запрасіў
Начальнік часці нечакана:
-- У ноч граніцу перайшлі... і г. д.

У вершах трапляюцца і такія нічым неапраўданыя вольнасці, як: «А вочы хітра, бегла ходзяць». Але не аб іх зараз гутарка. Мы хочам падкрэсліць нешта больш важнае, чым гэтыя паасобныя пагрэшнасці верша і стылю.

Вось А. Гейне ў пяці вершах апісаў прыгоды на граніцы: пагранічнік Нікіта Карацупа атрымлівае баявое заданне прасачыць і выкрыць шпіёна. Ён выконвае гэта заданне з поспехам і пасля адбыцця тэрміну службы героем вяртаецца на радзіму... Такі сюжэт верша «У дазоры» ў сваім празаічным пераказе і такі-ж самы ён у сваім паэтычным выражэнні. Паэт нічога не дадае да сказанага. Ён абмежаваўся тым, што добрасумленна зарыфмаваў гэты няхітры сюжэт. Напрашваецца пытанне: навошта было паэту пісаць верш, вышукваць рыфмы, прымушаць слова крочыць кароткімі радкамі, калі сэнс сказанага можна без усякай страты перадаць двума радкамі звычайнага празаічнага пераказу? Навошта такое малакарыснае скарыстанне сіл і энергіі?

Тое-ж самае можна сказаць і аб іншых вершах зборніка «Шчаслівая зорка» («Кітайскі сакрэт», «План», «Незвычайнае паляванне» і інш.). Ва ўсіх гэтых вершах расказана аб пэўнай падзеі, прычым сам паэт па-ранейшаму застаецца абыякавым і раўнадушным да расказанага. Магчыма, гэта задаткі эпасу, першыя крупінкі, так сказаць, эпічнага вопыту? У эпічным творы паэт можа заставацца ў баку ад нарысаванай ім карціны, затое карціна павінна валодаць цэльнасцю павествавання, усебаковай абрысоўкай дзеючых персанажаў, і ўсё гэта ў такой ступені, якая дазваляе чытачу скласці сабе да канца яснае ўяўленне аб сутнасці паказанага.

У вершах А. Гейне, якія па свайму ладу прымыкаюць да эпічнага жанру, няма людзей, няма самастойна існуючых персанажаў. Тыя, якія паяўляюцца ў вершах, ахарактарызаваны вельмі скупа, павярхоўна, двума-трыма знешнімі адзнакамі: «Высокая, стройная ў сіняй блузе», «бясстрашная Ліва», «бясстрашны шахцёр», «мужныя байцы», «іх вочы рашучасцю, помстай гараць». Калі ў вершах Гейне паяўляецца фашыст, то ён пападкатнаму «п'яны», а японскі афіцэр «стаў адразу як звер». Гэта тая наіўнасць і трафарэтнасць паэтычнага мышлення, якая робіць кнігу А. Гейне і не лірыкай і не эпасам, а проста зборам драных вершаў. Уся кніга стракаціць трафарэтнымі словамі і вызначэннямі, накшталт: «адважныя лётчыкі», «з адвагай сакаліпай», «адважнасцю палкай, воляю цвёрдай натхняла яна байцоў», «адважна байцы маладыя ў бойцы адбілі варожы напад», «адважны Баранаў Васіль», «матросы адважна стаялі», «адважны бег», «ад адважных астурыйскіх гарнякоў» і г. д. і т. п.

Тая-ж неабмежаваная ўлада трафарэту палохае і пры першым-жа азнаямленні з кнігай Рыгора Нехая «Па сонечных узгорках». У ёй столькі «радасных і шчаслівых песень», што ад іх робіцца невыносна нудна. Нашы маладыя паэты наіўна мяркуюць, што чым больш разоў яны скажуць слова «радасць», тым радасней будзе ўражанне ад іх вершаў. Але гэта не так. Сапраўдная чалавечая маладосць ніколі сябе не падкрэслівае, не запрашае любавацца сабою, не паўтарае тысячу разоў слова «малады», «маладая», «маладосць», «маладзёжная». Гэта хутчэй да твару падбадзёрваючаму сябе старому, які дарэмна імкнецца перакананаць і сябе і іншых у неіснуючай маладосці.

У вершах Гейне, Нехая і іншых маладых паэтаў столькі разоў прыгадваецца слова «малады», што мы часамі павінны сумнявацца ў сапраўднай іх маладосці. Сапраўдная маладосць не ў тым, каб бясконца паўтараць надакучыўшыя трафарэты: «маладосць наша поўная сіл», «выгляд стройны, малады» і г. д. Маладосць «у тым, каб глядзець пераўвелічанымі вачыма, у тым, каб дыхаць пераўвелічанымі глыткамі, пераўвелічанымі кросамі жыццё насцігаць і пераганяць» (Нік. Асееў). Яна «у трапнасці слоў і ў яркасці пачуццяў».

Трапнасць слоў! Як мала яе ў нашых маладых паэтаў. Яны паўтараюць з верша ў верш адны і тыя-ж старыя словы, аднолькавыя, як абаранкі. Вось прыклады з кнігі «Па сонечных узгорках»: «Сонечная радасць», «у радасную будучнасць» «магутным маршам нашай пяцігодкі», «як гімн жыццю», «краіна мая запяе гімн жыццю», «гімны-песні гарачай крыві», «над зямлёй падымаецца песня, як магутны бетховенскі спеў», «гімн багаццю», «ясныя зоры», «грозныя танкі», «стальная хада», «вокліч батарэі», «цёплае каханне», «светлы пакой» і г. д.

У Р. Нехая можна іншы раз сустрэць удалую пейзажную зарысоўку, у А. Гейне — паасобныя ўдалыя радкі, але агульны лад іх паэтычнага мышлення нам здаецца заганным. Ён абумоўлен агульнымі недахопамі нашай маладой паэзіі: ціхатай мыслі, адсутнасцю свежых і самастойных замыслаў, недастаткова ўважлівымі адносінамі да пытанняў паэтычнай формы. Значнымі творчымі поспехамі былі ўзнагароджаны тыя з маладых паэтаў, якія здолелі безагаворачна спыніць сябе на апошняй спробе ўпісаць у вершы першае трапіўшае трафарэтнае слова, накшталт «магутнага слова» ці «стальной хады». Для прыкладу П. Панчанка. Было-б пераўвелічэннем сказаць, што ў яго вершах адсутнічае трафарэт. Але ў вершах Панчанкі пераважае якасць зусім іншага парадку. Ён бачыць свет свежа і гэта свежасць жывым святлом асвятляе яго вершы.

Адназны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дзекаду. Уп Галоўлітбела № Г—1312.